Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 123 (5249)
СУБОТА
1
ЧЭРВЕНЯ
1935 г.
год выдання XVIII

## СЕННЯ У НУМАРЫ:

**У НАРКАМЗЕМЕ СССР І СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫМ АДДЗЕЛЕ ЦК ВКП(б)**—ЗАЦВЕРДЖАННЕ ПАСТАНОВЫ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА ВЫПРАЦОЎЦЫ, АБМЕРКАВАННЮ І ПРЫНЯЦЦЮ КАЛГАСАМІ СТАТУТАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

**ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР**—АБ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫМ ПАДАТКУ НА 1935 ГОД.

**ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР**—АБ САМААБКЛАДАННІ НА 1935 ГОД.

АДСТАЎКА ФРАНЦУЗСКАГА ГАБІНЕТА.

ЯПОНСКІЯ АКУПАНТЫ ПАГРАЖАЮЦЬ КІТАЮ ЗАНЯЦЬ БЕЙПІН І ЦЯНЬЦЗІН.

ПРЫЛЁТ ЧЭХАСЛАВАЦКАЙ ВАЕННАЙ АВІЯЦЫЙНАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ Ў МАСКВУ.

# У Наркамземе СССР і сельскагаспадарчым аддзеле ЦК ВКП(б)

Наркамзем СССР і сельскагаспадарчы аддзел ЦК ВКП(б) разгледзелі праекты пастаноў Лаўночна Каўказскага крайвыканкома і крайкома ВКП(б), СНК Беларускай ССР і ЦК КП(б)Б, соўнаркомаў і абкомаў ВКП(б) Крымскай, Карэльскай і Якуцкай АССР, Кіраўскага крайвыканкома і крайкома ВКП(б), Чэлябінскага аблвыканкома і абкома ВКП(б) і крайвыканкома і крайкома ВКП(б) Далёка-Усходняга края «Аб мерапрыемствах па выпрацоўцы, абмеркаванню і прыняцці калгасамі статутаў».

Указаныя праекты пастаноў адобраны Наркамземам СССР і сельскагаспадарчым аддзелам ЦК ВКП(б) з унясеннем у іх папраўак.

Найбольш важныя з гэтых папраўак наступныя:

1) **Па Лаўночна-Каўказскаму краю**—мерапрыемствы па выпрацоўцы калгасамі статутаў даны ў пастанове **асобна** па Дагестанскай АССР і кожнай нацыянальнай вобласці, якая ўваходзіць у склад краю;

Размер прысядзібных участкаў у **стаўропальскіх** раёнах краю ўстаноўлен ад 0,60 да 1 гектара і ў **терскіх** раёнах ад 0,50 да 0,75 гектара. Устаноўлена, што ў горных раёнах **Дагестана** і нацыянальных абласцей **тэрасныя** землі астаюцца ў асабістым карыстанні калгасных дваroў у размеры, устаноўленыя для 3-й групы.

2) **Па Беларускай ССР** — у Палескіх раёнах устаноўлен размер прысядзібных участкаў ад 0,30 да 0,60 гектара і ў астатніх раёнах рэспублікі ад 0,25 да 0,50 гектара:

у 9 раёнах рэспублікі, аднесеных да 1-й групы па колькасці жывёлы ў асабістым карыстанні калгаснага двара, дазволена калгасным дварам, якія разводзяць племянную жывёлу, мець у асабістым карыстанні дзве каровы і 3-4 галавы маладняка рагатай жывёлы.

3) **Па Крымскай АССР**—размер прысядзібных участкаў калгасных двароў устаноўлен у стэпавых зерневых раёнах ад 0,50 да 1 гектара, у падгорных раёнах — ад 0,25 да 0,50 гектара і ў раёнах табаководства і садаводства (паўднёвы бераг Крыма) — ад 0,25 да 0,30 гектара, — **адхілена** пранапова Соўнаркома і абкома ВКП(б) аб устанаўленні ў раёнах паўднёвага берага Крыма размеру ніжэй

аднесеных да 3-й групы па жывёле, калгасным дварам дазволена мець дадаткова ў асабістым карыстанні да 2-х кабыліц з прыплодам, а ў сельсоветах і населеных пунктах, аднесеных да 2-й групы,—адну кумысную кабыліцу і аднаго рабочага каня ці аднаго вала;

**калгасным дварам таежных раёнаў** рэспублікі дазволена мець дадаткова ў асабістым карыстанні калгаснага двара да 150 важэнак, маладняк у неабмежаванай колькасці, да 50 ездавых аленяў і неабмежаваную колькасць сабак, і ў тундравых раёнах да 250 важэнак, маладняк у неабмежаванай колькасці, да 100 ездавых аленяў і неабмежаваную колькасць сабак.

6) Па **Кіраўскаму** краю—устаноўлены 2 групы раёнаў па размерах прысядзібных участкаў: ад 0,25 да 0,40 гектара і ад 0,30 да 0,50 гектара;

адхілена пранапова крайвыканкома і крайкома ВКП(б) аб фарсаванні аінчасова з упарадкаваннем знешняга землеўпарадкавання калгасаў і землеўпарадчых работ унутры калгасаў на працягу 1935 г., паколькі апошнія патрабуюць сіл землеўпарадчыкаў і не могуць быць праведзены сіламі саміх калгаснікаў.

7) Па **Чэлябінскай** вобласці — калгасныя дворы казахскіх калгасаў у раёнах, прылягаючых да Казахскай АССР, аднесены па колькасці жывёлы ў асабістым карыстанні да 2-й групы раёнаў;

калгасным дварам 22 раёнаў

## Пастанова Совета Народных Камісараў Беларускай ССР і ЦК КП(б)Беларусі аб мерапрыемствах па выпрацоўцы, абмеркаванню і прыняццю калгасамі статутаў па Беларускай ССР

Совет Народных Камісараў і ЦК КП(б) Беларусі рэкамендуюць калгасам пры прыняцці статута ўносіць наступныя ўдакладненні ў Прыкладны статут сельскагаспадарчай арцелі, прыстасоўна да мясцовых умоў:

### ПА ПУНКТУ 2-МУ РАЗДЗЕЛУ II ПРЫКЛАДНАГА СТАТУТА

Рэкамендаваць калгасам устанавіць наступныя размеры прысядзібных зямель (агарод, сад)) у асабістым карыстанні кожнага калгаснага двара (не лічачы зямлі пад жылымі пабудовамі):

а) ад 0,25 гектара да 0,50 гектара ў раёнах:

Багушэўскі, Кармянскі, Сенненскі, Бешанковіцкі, Касцюковіцкі, Сіроцінскі, Будакашалёўскі, Чырвонапольскі, Суражскі, Быхаўскі, Клімавіцкі, Свяцілавіцкі, Бялыніцкі, Круглянскі, Талачынскі, Віцебскі, Крычаўскі, Церахаўскі, Веткаўскі, Лоеўскі, Уваравіцкі, Гарадоцкі, Лёзненскі, Хоцімскі, Гомельскі, Магілеўскі, Чавускі, Горацкі, Мсціслаўскі, Чачэрскі, Добрушскі, Мехаўскі, Чэрыкаўскі, Дрыбінскі, Аршанскі, Чашніцкі, Дубровенскі, Прапойскі, Шклоўскі, Журавіцкі, Рагачоўскі.

б) Ад 0,30 да 0,60 гектара ў раёнах:

Бабруйскі, Заслаўскі, Нараўлянскі, Барысаўскі, Капыльскі, Асіпавіцкі, Брагінскі, Чырвонаслабодскі, Асвейскі, Бягомльскі, Камарынскі, Пухавіцкі, Барэзінскі, Капаткевіцкі, Шарыцкі, Ветрынскі, Кіраўскі, Петрыкоўскі, Расонскі, Крупскі, Лозацкі, Глускі, Кі-

лам старшыні калгаса і ўпаўнаважаных ад калгаса, устаноўка межавых знакаў (слупоў).

Для ўстранення цераспалосіцы, далёказямелля і для нанясення на карту граніц калгасаў правесці наступныя мерапрыемствы:

а) мабілізаваць усіх землеўпарадчыкаў, працуючых па сваёй або другой спецыяльнасці ў розных установах і прадпрыемствах рэспублікі;

б) дадаткова скарыстаць для работы па землеўпарадкаванню 100 студэнтаў Горацкага сельскагаспадарчага інстытута і 130 студэнтаў Горацкага землеўпарадчага тэхнікума ў канікулярны час.

в) арганізаваць у раёнах месячныя курсы на 1.700 чалавек мершчыкаў і 180 чалавек чарцёжнікаў.

### ПА ПУНКТУ 5-му РАЗДЗЕЛУ III ПРЫКЛАДНАГА СТАТУТА

Аднесці ўсе раёны рэспублікі (за выключэннем ніжэйпайменаваных раёнаў) па колькасці жывёлы ў асабістым карыстанні кожнага калгаснага двара да першай групы раёнаў, у якой, у адпаведнасці з п. 5-м Прыкладнага статута, кожны калгасны двор можа мець у асабістым карыстанні **1 карову**, да 2-х галоў маладняка рагатай жывёлы, адну свінаматку з прыплодам або, калі праўленне калгаса знойдзе неабходным, 2 свінаматкі з прыплодам, да 10 авец і коз разам, неабмежаваную колькасць птушкі і трусоў і да 20 вуляў.

*Насустрач усебеларускаму народнаму свяце*

# ПІСЬМО КІРАЎЦАЎ ЗНАХОДЗІЦЬ ЖЫВЫ ВОДГУК СЯРОД НАЙШЫРЭЙШЫХ МАС ПРАЦОЎНЫХ БССР

## ГУТАРКА З САКРАТАРАМІ РАЙКОМАЎ

Учора рэдакцыя звязалася па тэлефону з сакратарамі райкомаў партыі па пытанню, які водгук атрымала ў іх раёнах пісьмо кіраўцаў у сувязі з падрыхтоўкай да ўсенароднага свята—угодкаў Беларусі ордэна Леніна.

Сакратар Шклоўскага райкома партыі тав. **Ермакоў** паведаміў, што пісьмо кіраўцаў было прапрацавана на куставых партыйных сходах. Калгаснікі перадавога ў раёне калгаса «Серп і молат» Аляксандрыйскага сельсовета, паслалі кіраўцам у адказ пісьмо. Яны заяўляюць, што даб'юцца прапа пастаўіць свае подпісы пад пісьмо тав. Сталіну. Рыхтуюць у адказ пісьмо кіраўцам і калгаснікі перадавога ў раёне Старасельскага сельсовета. 2 чэрвеня выступяць па радыё 4 лепшыя знатныя калгаснікі калгаса «Серп і молат» і раскажуць усім калгаснікам раёна, як яны дабіліся перамогі ў сваім калгасе.

У Смалявіцкім раёне (сакратар РК—тав. **Кудман**) таксама ва ўсіх калгасах прапрацоўваецца пісьмо кіраўцаў. Адбыўся злёт лепшых калгаснікаў Петравіцкага сельсовета. Падрыхтоўваецца ўсерабочны злёт калгаснікаў-ударнікаў.

К дню ўрачыстага Беларусі ордэна—11 ліпеня—у Забравіцкім сельсавеце будзе адкрыт новы клуб. К гэтаму-ж дню ў раёне будзе адкрыта 15 новых фізкультурных пляцовак. Лепшыя ўдарнікі дарожнага будаўніцтва абавязаліся да 11 ліпеня скончыць пабудову шасейнай дарогі.

У **Гомелі** рабочыя заводаў «Пролетарый» імя Кірава, імя Гікало, Гомсельмаш, «Рухавік рэволюцыі» імя Сталіна, «Прадма», фабрыкі

працоўцы пісьма ўзялі па сябе рад канкрэтных самаабавязацельстваў. Так, напрыклад, рабочыя завода «Пролетарый» абавязаліся скончыць праграму першага паўгоддзя да 20 чэрвеня, укараніць вопыт менкынцаў па механічнаму цэху і ў групе насосаў да 5 чэрвеня, а па варштатах Калава—да 15 чэрвеня.

Рабочыя гэтага-ж завода абавязаліся падрыхтаваць у бліжэйшыя месяцы не менш 20 чалавек на кіруючую работу, з якіх 5 чалавек на работу па-за заводам.

Пісьмо кіраўцаў прапрацавана і ва ўсіх прадпрыемствах і калгасах Барысаўскага раёна (сакратар райкома тав. **Лысак**).

Рабочыя запалкавай фабрыкі «Пролетарская перамога» імя Кірава абавязаліся да дня ўсенароднага свята ператварыць усю фабрыку ў фабрыку сацыялістычнай тэхнічнай прамысловасці і да 20 чэрвеня выканаць промфінплан першага паўгоддзя.

Рабочыя камбіната «Камінтэрн» абавязаліся выканаць промфінплан да 25 чэрвеня. Да 11 ліпеня адрамантаваць пяць кватэр рабочым-выдатнікам.

Рабочыя шклозавода фанерных заводаў № 21 і 25, друкарні лесазавода імя Молатава, скурзавода абавязаліся сустрэць усенароднае свята 100-процантнай здачай соцтэхэкзамена.

Калгаснікі калгаса «Маяк соцыялізма» абавязаліся да 5 чэрвеня абсталяваць першую ў раёне хату-лабараторыю, да 15 чэрвеня закончыць абсталяванне яслі і пачуньні, да 25 чэрвеня закончыць будаўніцтва калгаснага

лекарыстання;

Адхілена прапанова крайвыканкома і крайкома ВКП(б) аб **абмежаванні асобна** памеру саду і асобна памеру бахчы ў складзе прысядзібнай зямлі калгаснага двара;

калгасным дварам **стаўропальскай групы** раёнаў разнітай аўцагадоўлі дазволена мець у асабістым карыстанні дадаткова 10-15 авец і калгасным дварам раёнаў **Стаўропальшчыны** і **Терэка,** якія разводзяць племянную жывёлу калмыцкай, чырвона-нямецкай і сіментальскай пароды, дазволена дадаткова мець у асабістым карыстанні калгаснага двара 1 карову і 1-2 галавы маладняка;

па **Дагестанскай** АССР унесены наступныя змены ў пастановы аб колькасці жывёлы ў асабістым карыстанні калгаснага двара:

Кара-нагайскі раён аднесен да 4-й групы раёнаў па колькасці жывёлы ў асабістым карыстанні калгаснага двара, замест 3-й групы раёнаў;

калгасным дварам горных раёнаў, аднесеных да 3-й групы, дазволена мець дадаткова ў асабістым карыстанні аднаго каня і двух аслоў, ці двух горных быкоў і двух аслоў;

калгасным дварам, пашыруючым у Азербайджан і Грузію (ў пяці раёнах), дазволена мець дадаткова 20-30 авец, 2-3 коней, 2 горных быкоў і 2-3 аслоў;

адхілена прапанова аб устанаўленні для адпасобнікаў, прадаўшых коней да ўступлення ў калгас, растэрміноўванне кошту каня «на два гады», замест «да 6 год», як гэта прадугледжана Прыкладным статутам;

прынята прапанова аб дазволе калгасным дварам раёнаў Кабардына-Балкарыі, аднесеных да 1-й

**0,25 гектара;**

устаноўлена, што прырэзка прысядзібнай зямлі калгасным дварам паўднёвага берага Крыма не можа праводзіцца за кошт калгасных насеваў тэхнічных культур і аграмаджаных вінаграднікаў і садоў, а толькі за кошт асваення новай зямлі і зерневых насеваў;

калгасным дварам татарскіх калгасаў дазволена мець у асабістым карыстанні да 40 авец замест 10, прадугледжаных Прыкладным статутам для раёнаў першай групы, і 1-2 аслы, і калгасным дварам стэпавых раёнаў, якія разводзяць рагатую жывёлу чырвона-нямецкай пароды, дазволена мець у асабістым карыстанні дзве каровы і 3-4 галавы маладняка.

4) Па **Карэльскай** АССР — адхілена прапанова Соўнаркома і абкома ВКП(б) аб устанаўленні ў радзе раёнаў раздзеленых прысядзібных участкаў ніжэй 0,25 гектара і ўстаноўлен адзіны для ўсёй рэспублікі памер прысядзібнай зямлі калгасных двароў ад 0,25 да 0,35 гектара;

устаноўлена, што пры выдачы актаў на вечнае карыстанне зямлёй за калгасамі замацоўваюцца і наносяцца на карты калгаснага землекарыстання **азёры мясцовага значэння;**

ва ўсіх раёнах рэспублікі, аднесеных да 1-й групы па колькасці жывёлы ў асабістым карыстанні калгаснага двара, дазволена мець замест адной каровы і 2-х галоў маладняка па 2 каровы і 3-4 галавы маладняка;

у аленяводчых калгасах паўночнай часткі Карэліі дазволена мець дадаткова ў асабістым карыстанні калгаснага двара да 50 важэнак, маладняк у неабмежаванай колькасці і да 20 галоў ездавых аленяў.

5) Па **Якуцкай** АССР памер прысядзібных участкаў калгасных двароў устаноўлен у 1 гектар, за выключэннем прыленскіх сельсоветаў, у якіх памер прысядзібных участкаў вызначан ад 0,60 да 1 гектара;

у раёнах і наслежных советах, лягаючым да ішымскай і табольскай групы раёнаў, дазволена мець у асабістым карыстанні дзве каровы і 3-4 галавы маладняка;

калгасам засушлівай паласы Омскай вобласці дазволена ўносіць у 11-пункт VI раздзела статута дадатак аб стварэнні ва ўрацкайныя гады недатыкальнага, па выпадак неўраджаю, харчовага фонду ў памеры да 10 проц. ад колькасці зярна, якое ідзе на размеркаванне сярод членаў арцелі па працадзнях.

8) Па **Далёка-Усходняму** краю —мерапрыемствы па выпрацоўцы калгасамі статутаў даны ў пастанове **асобна па абласцях,** якія ўваходзяць у склад края.

Памер прысядзібных участкаў калгасных двароў **Усурыйскай вобласці і паўднёвай часткі Прыморскай вобласці** ўстаноўлен ад 0,50 да 0,70 гектара;

**Амурскай і Хабараўскай** абласцей, выключаючы паўночныя раёны, і **Яўрэйскай аўтаномнай вобласці** — ад 0,70 да 1 гектара; па ўсіх раёнах **Зейскай, Ніжне-Амурскай, Камчацкай і Сахалінскай** абласцей і па паўночных раёнах **Амурскай і Хабараўскай абласцей** — 1 гектар;

уся **поўнач** края (паўночныя раёны Прыморскай, Хабараўскай, Амурскай і Зейскай абласцей і ўсе раёны Нікне-Амурскай, Камчацкай і Сахалінскай абласцей) — аднесена па колькасці жывёлы ў асабістым карыстанні калгаснага двара — да 3-й групы раёнаў; калгасным дварам **таежных** раёнаў края дазволена мець у асабістым карыстанні да 150 важэнак, маладняк у неабмежаванай колькасці, да 50 ездавых аленяў і неабмежаваную колькасць сабак і калгасным дварам **тундравых** раёнаў — да 250 важэнак, маладняк у неабмежаванай колькасці, па 100 ездавых аленяў і неабмежаваную колькасць сабак.

**НІЖЭЙ ПУБЛІКУЕЦЦА:**

Адобраная Наркамземам СССР і сельскагаспадарчым аддзелам ЦК ВКП(б) пастанова Соўнаркома Беларускай ССР і ЦК КП(б)Б. Чаўскі, Плешчаніцкі, Дамачэўскі, Лагойскі, Рэчыцкі, Дзяржынскі, Лельчыцкі, Расонскі, Дрысенскі, Лепельскі, Рудзенскі, Ельскі, Любанскі, Слуцкі, Жлобінскі, Менскі, Смалявіцкі, Жыткавіцкі, Мазырскі, Старадарожскі, Старобінскі, Уздзенскі, Халопеніцкі, Тураўскі, Ушацкі, Хойніцкі, Чэрвеньскі.

У калгасных дварох, якія маюць прысядзібныя ўчасткі, перавышаючыя ўстаноўленую для раёна прадзельную норму,—лішкі прысядзібнай зямлі супроць гэтай прадзельнай нормы адразаюцца.

Калгаснікам, якія маюць прысядзібныя ўчасткі менш устаноўленага для адпаведнага раёна нізэйшага прадзелу, прысядзібная зямля можа быць прырэзана да нізэйшага прадзеду за лік адрэзкі зямлі ў калгасных дварох, маючых лішкі прысядзібнай зямлі супроць устаноўленага верхняга прадзелу, за лік нескарыстаных у сучасны момант прысядзібных зямель, шляхам зніжэння памеру прысядзібнай зямлі аднаасобнікаў на 10 проц. супроць памеру сядзіб калгаснікаў, а таксама за лік раскарчоўкі і асваення новых зямель.

Для калгасных двароў, якія маюць на прысядзібнай зямлі сады ў памеры звыш 0,20 гектара, дапускаць павелічэнне прысядзібнага ўчастку, але не звыш 0,80 гектара, уключаючы і сад.

Усе змены ў фактычным карыстанні прысядзібнай зямлёй у адпаведнасці з прынятым і зарэгістраваным статутам, робяцца ўвосень 1935 года.

У адпаведнасці з пунктам 2-м Прыкладнага статута сельскагаспадарчай арцелі райвыканкомам правесці замацаванне зямлі за ўсімі калгасамі ў бестэрміновае карыстанне, г. зн. навечна і выдаць кожнаму калгасу акт на бестэрміновае карыстанне зямлёй, у якім устанаўліваюцца памеры і дакладныя граніцы зямлі, што знаходзіцца ў карыстанні арцелі, у наступныя тэрміны:

а) 1.400 калгасам—к 1-му жніўня 1935 года,

б) 2.000 калгасам—к 1-му верасня 1935 года,

в) 2.400 калгасам—к 1-му студзеня 1936 года,

г) 5.100 калгасам—к 1-му лістапада 1936 года.

Адначасова з выдачай калгасу акта на вечнае карыстанне зямлёй павінна праводзіцца, з удзелам калгасных двароў, якія ў ніжэйпералічаных раёнах разводзяць племянную жывёлу, мець у асабістым карыстанні дзве каровы і 3-4 галавы маладняка рагатай жывёлы:

Асвейскі, Чырвонаслабодскі, Дзяржынскі, Дрысенскі, Капыльскі, Плешчаніцкі, Старобінскі (паўночная частка), Уздзенскі, Бягомльскі.

Аднесці **палескія раёны:** Брагінскі, Глускі, Дамановіцкі, Ельскі, Жыткавіцкі, Капатковіцкі, Камарынскі, Лоеўскі, Лельчыцкі, Любанскі, Мазырскі, Нараўлянскі, Парыцкі, Петрыкоўскі, Рэчыцкі, Церахаўскі, Тураўскі, Хойніцкі і паўднёвую частку Старобінскага раёна (палескую частку) да 2-й групы раёнаў, у якой, у адпаведнасці з пунктам 5-м Прыкладнага статута, кожны калгасны д можа мець у асабістым карыстанні 2-3 каровы і, апрача таго, маладняк, ад 2-х да 3-х свінаматак з прыплодам, ад 20 да 25 авец і коз разам, неабмежаваную колькасць птушкі і трусоў і да 20 вуллёў.

**ПА ПУНКТУ 6-му IV раздзела ПРЫКЛАДНАГА СТАТУТА**

Рэкамендаваць сельскагаспадарчым арцелям уключыць у статут дадаткова, выходзячы з мясцовых умоў, абавязкі арцелі і праўленняў па:

падзёму і асваенню цалінных зямель (раскарчоўка, меліярацыя і т. д.);

развіццю ільнаводства (расшырыць насенніцкі канюшыны, поўнасцю выцесніць насеў ільну па ільну і папару, насевы ільну рабіць выключна ў раннія тэрміны, расціл ільну праводзіць у жніўні і, як правіла, на лугах, арганізаваўшы пільны догляд і ахову ільну на сцелішчах, заўчасна падрыхтаваць мачылы для мочыва ільну, укараняць механізацыю ўборкі і першапачатковай апрацоўкі ільну);

паляпшэнню развядзення бульбы;

угнаенню глебы торфам, камюстам, скарыстанню ванны і мергелю на кіслых глебах, развіццю насеваў лубіну на папарных землях;

сцягванню хутароў у калгасныя пасёлкі і дапамозе калгасным дварам пры пераселенні з хутароў у калгасныя пасёлкі;

утрыманню ў добрым праездным стане дарог.

**Старшыня Совета Народных Камісараў БССР**
**ГАЛАДЗЕД.**

**Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.**

## ЗАВАЮЮ ПРАВА ПАДПІСАЦЬ ПІСЬМО т. СТАЛІНУ

Я — былы батрак. Працаваў на кулакоў. І толькі ў 1930 годзе, калі ўступіў у калгас, знайшоў сваё шчаслівае жыццё.

Шчыра працую, і мяне паважаюць. За год па два-тры разы прэміруюць. А колькі дабра атрымліваю на працадні! Летась, напрыклад атрымаў 3573 кілаграмы бульбы і 1191 кілограм хлеба. Апрача таго, праўленне калгаса надзяліла мяне цёлкай.

Сёлета я працую конюхам. Дзякуючы майму добраму догляду, усе 48 коней нашай сярэдняй упітанасці і зараз, пасля веснавых палявых работ. Маючы добрых коней, наш калгас спраўна правёў веснавую сяўбу і скончыў яе на 15 дзён раней чым у мінулым годзе.

Ні адна кабыла не абартавала. З 8 жарабоных кабыл узко 7 ажарабіліся. Жарабяты ўсе здаровенькія. З поспехам мы праводзім цяпер злучную кампанію.

На грамадскай рабоце я—камсамолскі арганізатар, член Падонкаўскага сельсовета і кандыдат яго прэзідыума. Я прымацаваны да вёскі Косіна і змагаюся за тое, каб яна была перадавой.

З вялікім задавальненнем я прачытаў зварот знатных людзей завода імя Кірава аб пасылцы пісьма любімаму і роднаму правадыру тав. **Сталіну.** Я цалкам адабраю гэту капітоўную прапанову. Буду працаваць яшчэ лепш, каб падрыхтаваць конскае пагалоўе да ўборкі, каб наш калгас быў перадавым па ворыву папару, па праполцы, а таксама на ўборцы і хлебаздачы.

Я хачу заваяваць права разам з іншымі знатнымі людзьмі Савецкай Беларусі падпісаць пісьмо любімаму, роднаму Сталіну.

**Конюх калгаса «Перамога», Лагойскага раёна**
**МІХАСЬ КЛЮЧКО.**

## ШТО МЫ РАСКАЖАМ тов. СТАЛІНУ

ПОЛАЦК. Прапанова кіраўцаў знашла жывы водгук сярод лепшых людзей Полацкага раёна. Пісьмо абмяркоўваюць знатныя людзі прадпрыемстваў, калгасаў, дактары і школьнікі. Усе заяўляюць, што кіраўцы выказалі думку ўсіх працоўных, бо толькі да яго, вялікага правадыра тав. **Сталіна,** могуць быць накіраваны нашы першыя думкі ў дзень найвялікшага свята — атрымання ордэна Леніна.

Абмяркоўваючы пісьмо, рабочыя ўспамінаюць сваё мінулае жыццё і параўноўваюць яго з радасным жыццём цяперашняга дня.

45 лепшых ударнікаў дэсантавода расказваюць, як яны працавалі на старога гаспадара Мінца. Зараблялі па 40 кап. у дзень. Жылі ў падвалах, а зараз яны зарабляюць па 200 і 250 руб. у месяц. Усе жывуць у добрых кватэрах. За кошт завода ўсе кватэры радыёфікаваны

— Гэтым мы абавязаны нашаму **Сталіну.** І аб гэтым нам хочацца яму расказаць, — гаварацца яны.

Група школьнікаў-выдатнікаў VI, VII і VIII класаў просяць расказаць у пісьме тав. **Сталіну,** як жывуць і вучацца нашы дзеці. Яны дзякуюць правадыру за яго клопаты аб школе, за яго клопаты аб дзецях.

**ЗЕЛЬМАНАЎ.**

## САМАПРАВЕРКА УЗЯТЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

ДЗЯРЖЫНСК. **(Па тэлефону).** Пісьмо знатных людзей завода імя **Кірава** абмяркоўваецца калгаснікамі і рабочымі соўгасаў Дзяржынскага раёна. Калгасніца Сняжко з калгаса «9 студзеня» сумесна з работнікамі фермы, працоўваючы пісьмо кіраўцаў, заявіла: «Якое шчасце будзе нам, выдатным людзям калгаса, расказаць нашаму любімаму правадыру таварышу **Сталіну,** як мы ажыццяўляем яго словы аб жывёлагадоўлі. Я выкадавала ў калгасе 207 цялят, з якіх ужо ёсць 50 дойных кароў. Рыхтуючыся да вялікага свята, я буду яшчэ больш старацца, каб поўнасцю авалодаць тэхнікай жывёлагадоўлі і вучыць сваіх таварышоў».

Работнікі фермы арганізуюць самаправерку ўзятых самаабавязацельстваў.

Газеты «Ударнік Дзяржыншчыны», «Штурмовец Дзяржыншчыны» ў сувязі з падрыхтоўкай пісьма тав. **Сталіну** арганізавалі на сваіх старонках трыбуну знатных людзей калгасаў, соўгасаў, МТС, школ.

**РАМАНОЎСКІ.**

# АБ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫМ ПАДАТКУ НА 1935 г.

## *Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР*

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў Саюза ССР **пастанаўляюць:**

I. Прадоўжыць на 1935 год дзеянне «Палажэння аб сельскагаспадарчым падатку на 1934 год» (З. з. СССР 1934 г., № 30, арт. 231, № 45, арт. 353), са зменамі, указанымі ў наступных артыкулах.

II. Для **калгасаў** захаваць на 1935 г. без змен стаўкі падатку на адзін гектар пасеваў і насаджэнняў на саюзных рэспубліках, а таксама ільготы, дзейнічаўшыя ў 1934 г., апрача ільготы, прадугледжанай у арт. 24 «Палажэння аб сельскагаспадарчым падатку на 1934 г.».

III. Унесці наступныя змены ў абкладанне сельскагаспадарчым падаткам гаспадарак **калгаснікаў:**

а) устанавіць для гаспадарак калгаснікаў, маючых даходы ад неабагуленай сельскай гаспадаркі (ад агароду, саду і т. д.), стаўкі падатку ў размеры ад 10 да 40 руб. на гаспадарку.

У межах гэтых ставак Соўнаркомы РСФСР, УССР і ЗСФСР устанаўляюць сярэднія стаўкі падатку для паасобных рэспублік, краёў і абласцей, якія ўваходзяць у склад адпаведных саюзных рэспублік.

Советы народных камісараў БССР, УзбССР, ТуркССР і ТаджССР, рэспублік, уваходзячых у склад ЗСФСР, і аўтаномных рэспублік, а таксама краявыя і абласныя выканаўчыя камітэты устанаўляюць сярэднія стаўкі падатку для паасобных раёнаў.

Раённыя выканаўчыя камітэты ўстанаўляюць стаўкі для паасобных населішчаў, а ў неабходных выпадках і для паасобных калгасаў.

Устанаўліць у межах калгасаў розныя стаўкі для паасобных гаспадарак калгаснікаў не дазваляецца;

б) для гаспадарак калгаснікаў, маючых побач з даходам ад неабагуленай сельскай гаспадаркі пастаянныя даходы ад некааперараных саматужна-рамесніцкіх промыслаў, стаўку падатку (п. «а») павысіць на 40-80 проц.

Соўнаркомы саюзных і аўтаномных рэспублік, краявыя і абласныя выканкомы ўстанаўляюць канчатковыя размеры павышэння для кожнага раёна, прычым для розных відаў промыслаў могуць быць устаноўлены розныя процанты павышэння стаўкі.

Соўнаркомы саюзных рэспублік, краявыя і абласныя выканкомы могуць не прымяняць указанага вышэй павышэння ставак падатку да гаспадарак калгаснікаў, маючых пастаянныя даходы ад некааперараных саматужна-рамесніцкіх промыслаў, у паасобных раёнах і ў адносінах для паасобных промыслаў.

У тых выпадках, калі запяцце саматужна-рамесніцкім промыслам мае выпадковы характар і даходы ад промыслу нязначныя, павышэнне стаўкі падатку для такіх гаспадарак калгаснікаў не робіцца.

IV. Унесці наступныя змены ў абкладанне сельскагаспадарчым падаткам **адпаасобных працоўных гаспадарак:**

а) устанавіць па саюзных рэспубліках наступныя нормы даходнасці ў рублях:

| ДАХОДНАСЦЬ ГЕКТАРА ЗЯМЛІ | РСФСР | УССР | БССР | ЗСФСР | УзбССР | ТуркССР | ТаджССР |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ✓ | ✓ | ✓ | | | | |
| Пасеваў зернавых і інш. культур, апрача пералічаных ніжэй | 80 | 80 | 83 | 83 | 140 | 135 | 115 |
| Агародаў і бахчаў | 675 | 590 | 690 | 690 | 525 | 525 | 500 |
| Пасеваў бульбы | 210 | 160 | 235 | 235 | — | — | — |
| Пасеваў табаку і махоркі | 400 | 360 | — | 600 | 460 | 460 | 460 |
| Садоў і ягаднікаў | 675 | 675 | 675 | 770 | 900 | 900 | 900 |
| Вінаграднікаў | 1100 | 975 | — | 880 | 1000 | 1000 | 900 |
| Сенажацей | 28 | 40 | 30 | 28 | — | — | — |
| **Даходнасць галавы жывёлы.** | | | | | | | |
| Кароў рабочага тыпу | 120 | 140 | 130 | 90 | 90 | 80 | 80 |

Ва ўсіх выпадках аклад падатку з адпаасобнай гаспадаркі павінен быць не менш чым на 25 проц. вышэй ставак, устаноўленых у данай мясцовасці для калгаснікаў;

ж) адпаасобным працоўным гаспадаркам, маючым у свайм складзе не больш двух працаздольных, прадастаўляць на непрацаздольных членаў гаспадаркі наступныя скідкі з налічанага падатку: пры трох непрацаздольных размер падатку паніжаецца на 10 проц., пры 4-х і больш непрацаздольных —на 20 проц.;

з) адпаасобныя працоўныя гаспадаркі, не маючыя працаздольных членаў сям'і, калі прытым у гаспадарцы няма буйнай жывёлы, могуць поўнасцю ці часткова вызваляцца ад падатку па маламоцнасці райвыканкомамі па спісах, прадстаўляемых сельскімі советамі;

і) вызваліць ад сельгаспадатку гаспадаркі сялян-адпаасобнікаў, у якіх глава (асноўны працаздольны работнік) перайшоў рабочым на пастаянную работу ў соўгас па працоўнаму дагавору, а астатнія працаздольныя работнікі гэтай адпаасобнай гаспадаркі заключылі працоўны дагавор з соўгасам на сезонныя работы.

Гэта ільгота прадастаўляецца толькі тым гаспадаркам, якія з прычыны пераходу на работу ў соўгасы не атрымліваюць планавых заданняў па пасеву і вызвалены ад абавязковых паставак дзяржаве зярна, сланечніка, бульбы і рыбы.

V. Адпаасобныя працоўныя гаспадаркі, уступіўшыя ў калгасы да першага тэрміну ўплаты сельгаспадатку па данаму населішчу, абкладаць, як калгаснікаў.

VI. Адмяніць арт. 24 поўнасцю, пп. «б», «в», «г», «д», «е», «ж», арт. 39, пп. «б», «в», «г», «д», «е», «ж» арт. 82, арт. 84 і 93 «Палажэння аб сельскагаспадарчым падатку на 1934 год».

VII. Кулацкія гаспадаркі абкладаць у парадку і па стаўках, устаноўленых у «Палажэнні аб сельгаспадатку на 1934 год».

VIII. Захаваць на 1935 г. устаноўленыя ў 1934 г. тэрміны ўплаты сельгаспадатку.

| Размер абкладаемага даходу гаспадаркі | Размер падатку на гаспадарку |
|---|---|
| Да 100 руб. | 15 руб |
| 101—125 » | 17 » |
| 126—150 » | 20 » |
| 151—175 » | 24 » |
| 176—200 » | 28 » |
| 201—225 » | 32 » |
| 226—250 » | 36 » |
| 251—275 » | 40 » |
| 276—300 » | 44 » |
| 301—325 » | 48 » |
| 326—350 » | 52 » |
| 351—375 » | 56 » |
| 376—400 » | 60 » |
| 401—425 » | 66 » |
| 426—450 » | 73 » |
| 451—475 » | 81 » |
| 476—500 » | 89 » |
| 501—525 » | 97 » |
| 526—550 » | 105 » |
| 551—575 » | 113 » |
| 576—600 » | 121 » |
| 601—625 » | 129 » |
| 626—650 » | 137 » |
| 651—675 » | 145 » |
| 676—700 » | 154 » |
| 701—725 » | 164 » |
| 726—750 » | 174 » |
| 751—775 » | 185 » |
| 776—800 » | 196 » |
| 801—1000 » | 200 руб. + 40 кап. |

# Аб самаабкладанні на 1935 г.

## Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў Саюза ССР **пастанаўляюць:**

1. Прадоўжыць на 1935 год дзеянне пастановы ЦВК і СНК СССР ад 31 мая 1934 г. «Аб самаабкладанні сельскага насельніцтва на 1934 г.» (З. З. СССР 1934 г., № 30, арт. 232) са зменамі, указанымі ў наступных артыкулах.

2. Устанавіць наступныя стаўкі самаабкладання для гаспадарак **калгаснікаў:**

а) для гаспадарак, не маючых неабагуленых даходаў, абкладаемых у 1935 г. сельскагаспадарчым падаткам,— стаўку у размеры 2 руб., замест 5 руб. у 1934.;

б) для гаспадарак, маючых неабагуленыя даходы, абкладаемыя у 1935 г. сельскагаспадарчым падаткам,— стаўку ў размеры ад 3 да 9 руб., замест 8—20 рублёў у 1934 г.

3. Стаўкі самаабкладання для адпаасобных працоўных гаспадарак устанавіць у размеры ад 40 да 60 проц. акладу сельгаспадатку.

Ва ўсіх выпадках аклад самаабкладання с адпаасобнай гаспадаркі павінен быць не менш чым на 25 проц. вышэй ставак самаабкладання, устаноўленых у данай мясцовасці для калгаснікаў, абкладаемых сельгаспадаткам.

4. Кулацкія гаспадаркі прыцягваць, як у 1934 г., да самаабкладання ў размеры 200 проц. акладу сельскагаспадарчага падатку на 1935 г.

5. Адмяніць уключэнне ў мясцовыя бюджэты сродкаў, сабраных па самаабкладанню (арт. 2 закона аб самаабкладанні на 1934 г).

6. Устанавіць, што да 65 проц. сродкаў, сабраных па самаабкладанню, ідуць на школьнае будаўніцтва ў сельскіх мясцовасцях у дадатак да сум, прадугледжваемых па бюджэту.

Прадаставіць раённым выканкомам права перарасмяркоўваць гэтыя сродкі памiж сельсоветамі ўнутры раёна ў залежнасці ад плана школьнага будаўніцтва.

7. Не менш 35 проц. сродкаў, сабраных па самаабкладанню, астаўляць у распараджэнні сельсоветаў на культурна-бытавыя патрэбы сяла, не прадугледжаныя сельскім бюджэтам.

8. Па прадстаўленню сельсоветаў райвыканкомам прадастаўляецца права часткова ці поўнасцю вызваляць ад уплаты самаабкладання гаспадаркі калгаснікаў, а таксама ў паасобных выпадках адпаасобныя працоўныя гаспадаркі, не маючыя працаздольных членаў сям'і, калі пры тым у гаспадарцы няма буйнай жывёлы.

9. Адмяніць артыкулы 9 і 11 закона «Аб самаабкладанні сельскага насельніцтва на 1934 год».

10. Даручыць Совету Народных Камісараў Саюза ССР зацвердзіць змены законадаўства Саюза ССР, выцякаючыя з данай пастановы.

**Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР М. КАЛІНІН.**
**Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ.**
**Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР І АКУЛАЎ.**

Масква, Крэмль.
31 мая 1935 г.

# ГРУЗІНСКІЯ І БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ НА ПРЫЁМЕ У СОУНАРКОМЕ БССР

За час свайго прабывання ў сталіцы БССР пісьменнікі брацкай ордэнаноснай рэспублікі — Совецкай Грузіі азнаёміліся з культурным будаўніцтвам у нашай краіне, наведалі перадавыя прадпрыемствы горада, рад кіруючых устаноў. Аблічча нашай краіны, маштабы яе сацыялістычнага будаўніцтва ўжо вядомы ім у агульных рысах. Маючы на мэце напісаць кнігу пра Совецкую Беларусь, кожны з грузінскіх пісьменнікаў фармуе ўжо тэму, вызначае сваё творчае заданне.

Брыгада выязджае на перыферыю для азнаямлення з прадпрыемствамі, соўгасамі, калгасамі Совецкай Беларусі, для азнаямлення з людзьмі, вобразамі сваёй будучай кнігі.

***

27 мая брыгада грузінскіх пісьменнікаў наведала Соўнарком БССР і мела гутарку з старшынёй праведзеную ў недалёкім мінулым, пра асваенне класічнай спадчыны грузінскай літаратуры. Рэплікамі, заўвагамі, тлумачэннямі асобных з'яў і фактаў яго дапаўняюць астатнія грузінскія пісьменнікі.

Пасля гэтага т. Галадзед азнаёміў грузінскіх таварышоў з тым, як ідзе сацыялістычнае будаўніцтва ў БССР.

— Велізарнейшае палітычнае і культурнае значэнне мае паездка грузінскіх пісьменнікаў у БССР і беларускіх—у Грузію, — гаворыць тав. Галадзед. —Напісанне кніг пра абедзве рэспублікі — задача надзвычай пачэсная, але нельга забываць, што задача гэта і цяжкая. Кнігі, што будуць напісаны, пашыраць інтэрнацыянальную сувязь не толькі саміх пісьменнікаў, але і народаў Совецкай Беларусі і Совецкай Грузіі.

Гаворачы пра беларускую совецкую літаратуру тав. Галадзед зазначае:

# ВЫПУСКНІКІ КУРСАЎ ЦВК НА ПРЫЁМЕ У тав. ЧАРВЯКОВА

28 мая закончылі работу двухмесячныя курсы пры ЦВК БССР па падрыхтоўцы інструктароў і сакратароў райвыканкомаў. Курсы скончыла 18 чалавек. З іх 5 чалавек накіроўваюцца ў раёны сакратарамі райвыканкомаў, астатнія — інструктарамі. Большасць курсантаў будзе працаваць у новаарганізаваных раёнах рэспублікі.

29 мая курсанты былі прыняты старшынёй ЦВК БССР А. Г. Чарвяковым. На прыёме прысутнічалі: інструктар ЦВК СССР тав. Уманаў і адказныя работнікі апарата ЦВК БССР. Курсанты падрабязна расказалі тав. Чарвякову аб сваёй вучобе.

— На курсах мы навучыліся

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Каровы | 105 | 105 | 105 | 75 | 80 | 75 | 75 |
| Вала і быка | 55 | 75 | 65 | 65 | 65 | 55 | 55 |
| Асла | 15 | 15 | — | 15 | 15 | 15 | 15 |
| Авечкі і казы | 5 | 5 | 5 | 6 | 6 | 6 | 5 |

УВАГА: Па УзбССР, ТуркССР і ТаджССР нормы даходнасці зерневых культур даны на гектар паліўнога пасеву. Нормы для багарных пасеваў устанаўляюцца советамі народных камісараў гэтых рэспублік;

б) па ўсіх пасевах, праведзеных адналасобнымі працоўнымі гаспадаркамі звыш зацверджаных для іх планаў азімай сяўбы 1934 г. і яравой сяўбы 1935 г., вызначаць абкладаемы даход па палавінных нормах даходнасці;

в) прыцягваць да абкладання коней, валоў, буйвалаў, аслоў і мулаў ва ўзросце ад трох гадоў;

г) па неземляробчых заработках уключаць у абкладаемы даход ад 50 да 100 проц. валавога даходу

1X. Даручыць Совету Народных Камісараў Саюза ССР зацвердзіць змены законадаўства Саюза ССР, выцякаючыя з данай пастановы.

**Старшыня ЦВК Саюза ССР**
**М. КАЛІНІН.**

**Старшыня СНК СССР**
**В. МОЛАТАЎ.**

**Сакратар ЦВК СССР**
**І. АКУЛАЎ.**

Масква, Крэмль.
31 мая 1935 г.

| | | |
|---|---|---|
| | | з кожнага рубля даходу звыш 800 руб. |
| 1000--2000 | 280 руб. + 44 кап. | з кожнага рубля даходу звыш 1000 р. |
| 2000--3000 | 720 руб. + 48 кап. | з кожнага рубля даходу звыш 2000 р. |
| Звыш 3000 руб. | 1200 руб. + 55 кап. | з кожнага рубля даходу звыш 3000 р. |

# Чаму адстае Асінторф

1.

Ужо даўно перавалілa за поўдзень, а ў брыгадзе **Бортнікава** ўсё яшчэ вазіліся з машынай.

Машына ніяк не падавалася — падкладак не хапала, казялкі не на месцы, тросы пераблытаны. Маладыя, здаровыя хлопцы стаяць гурбой, не ведаюць за што ўзяцца, куды прыкласці свае рукі. Сам Бортнікаў кідаецца ва ўсе бакі. Хапаецца за рычагі, бяжыць за бярвеннямі.

Нарэшце, расчараваны і ўспацеўшы, брыгадзір прысеў крыху перадахнуць.

«Ну, што мы сёння зрабілі, — барматаў ён сам пра сябе. — Сем гадзін патрацілі на перасоўку, а колькі-ж прайшлі, ажно сорамна сказаць... 8 метраў. Так далей нельга працаваць».

Сумны факт, але-ж праўдзівы.

Ці вінаваты **Бортнікаў, Панаеў, Разумовіч** і дзесяткі другіх брыгадзіраў Асінторфа ў тым, што яны трацяць цэлыя гадзіны каштоўнейшага часу на перасоўку машын?

На заводзе іх бічуюць, заносяць на чорную дошку за непрадукцыйнае выкарыстанне часу, за невыкананне плана.

Аднак, на Асінторфе не заўважаюць самага галоўнага. Указанне таварыша **Сталіна** аб тым, што **«тэхніка без людзей, аўладаўшых тэхнікай, — мёртва»** не знайшло ніякага адлюстравання ў рабоце завода. У гэтым сезоне на тарфяным участку прышлі тысячы калгаснікаў-ударнікаў, якія гараць жаданнем працаваць, выконваць план. Але-ж **іх не вучаць.** Ні ў адной брыгадзе не наладжана тэхнічная вучоба. Вялікія прастоі, частыя аварыі, нізкая прадукцыйнасць працы заядаюць завод. З 31 брыгады больш паловы не выконваюць сваіх сутачных заданняў.

На заводзе нямала знатных людзей торфу, якія паказваюць прыклады высокапрадукцыйнай работы. Брыгадзіры **Афанасенка, Чыжык, Федчанка, Кузачкін, Баркоўскі** і другія славяцца па ўсёй Беларусі. Яны прэтэндуюць на пярэнства ў вытворчым паходзе за торф імя **Гікало.** Але іх вопыт не перадаецца адстаючым брыгадам. Тарфяны камітэт на чале з т. **Бароўскім** лічыць, што гэта не яго справа.

Шматлікі інжынерна-тэхнічны персанал не скарыстоўваецца для ўзняцця кваліфікацыі тарфянікаў і тарфяніц.

Кіраўніцтва завода праяўляе антыдзяржаўныя адносіны да механізацыі працаёмкіх працэсаў. На торфзаводзе «Большэвік» ужо даўно прыстасаваны да элеватарных машын зваротныя рольныя сталы, якія замяняюць двух рабочых і значна павялічваюць прадукцыйнасць працы. На Асінторфе працуе 18 машын і ні на адной з іх не ўстаноўлен зваротны рольны стол.

Механік **Ялугін** унёс прапанову —зрабіць на другім участку ад пасёлка да кар'ера вузкакалейку ў 500 метраў для падвозкі харчу на поле. Гэта павінна каштаваць толькі 700 руб., а эканомія будзе ў некалькі тысяч. Многа часу дажала гэта прапанова ў галоўнага інжынера Власава, а потым праект вярнулі Ялугіну з рэзалюцыяй: «Зрабіць дадатковы разлік». А які разлік, Ялугін ніяк не разумее.

2.

Дырэктар завода т. Войтаў тлумачыць адставанне Асінторфа выключна недахватам рабочай сілы. І сапраўды, заводу не хапае яшчэ звыш 2 тысяч рабочых. Замест 40 брыгад працуе 31 і то поўнасцю не ўкамплектаваныя.

Але чым можа вытлумачыць дырэкцыя той факт, што з прыехаўшых рабочых каля 100 чалавек пакінулі працу на заводзе?

Цякучасць рабочых мае свае прычыны.

Не хапае жыллёвай плошчы. У бараках цесна і брудна, не ўсе рабочыя забяспечаны жалезнымі ложкамі, коўдрамі. У інтэрнатах п'юць чай па чарзе (на барак адна шклянка).

У сталовых ліквідавалі чамусьці паблюдную сістэму. Брыгады харчуюцца па ордэрах. Страва стандартная: два разы ў дзень капуста.

Культурнае абслугоўванне тарфянікаў, іх палітычнае выхаванне ўсё яшчэ ў «стадыі разгортвання». Чырвоныя куткі ёсць ва ўсіх пасёлках, але ніякай работы там не праводзіцца.

Для правядзення культурна-масавай работы да кожнага інтэрната прымацаваны комуністы і комсамольцы. Але большасць іх нічога не робіць. Комуністы **Ігнацьеў, Кашановіч, Гайдук** ні разу нават не былі ў брыгадах.

3

Слаба пастаўлена ўнутрыпартыйная работа. На партыйных сходах пераважаюць у большасці гаспадарчыя пытанні.

З 80 комуністаў толькі 16 працуюць непасрэдна на вытворчасці —у кар'еры. Частка з іх не паказвае прыкладу ў рабоце. Змена комуніста **Раманоўскага** на машыне № 14, брыгады агрэгата комуніста **Штзера** ўвесь час зрываюць план.

У красавіку Аршанскі райком КП(б)Б правёў выязное пасяджэнне на Асінторфе, на якім быў заслуханы даклад сакратара парткома т. **Капялевіча** аб становішчы ўнутрыпартыйнай работы. Але канкрэтныя прапановы па перабудове партыйнай работы ва ўмовах Асінторфа РК да гэтага часу «выпрацоўвае».

Райком паслаў на Асінторф групу раённага актыва з 9 чалавек для дапамогі ў наладжанні партыйнай работы. Але замест дапамогі партгрупам гэтыя таварышы ператварыліся ў начальнікаў машын, падмяняюць комуністаў і знялі з сябе ўсю адказнасць, усклаўшую на іх.

4.

Асінторф павінен здабыць у гэтым сезоне 210 тысяч тон торфу— 50 проц. усёй здабычы трэста Белторфа. За першы месяц завод недадаў 14 тысяч тон торфу. Штодзённыя заданні выконваюцца на 50—60 проц.

Прычыны адставання Асінторфа —ясныя. Яны крыюцца ў сістэме работы, у метадах кіраўніцтва, у адносінах да матэрыяльна-бытавых умоў рабочых-тарфянікаў.

**М. ФРУМКІН.**

1X. Даручыць Совету Народных Камісараў Саюза ССР зацвердзіць змены законадаўства Саюза ССР, выцякаючыя з данай пастановы.

**Старшыня ЦВК Саюза ССР**
**М. КАЛІНІН.**

**Старшыня СНК СССР**
**В. МОЛАТАЎ.**

**Сакратар ЦВК СССР**
**І. АКУЛАЎ.**

Масква, Крэмль.
31 мая 1935 г.

## ГРУЗІНСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ ВЫЕХАЛІ У ГОМЕЛЬ

Брыгада грузінскіх совецкіх пісьменнікаў у складзе тт. **Буачыдзе, Лордкіпанідзе, Мосашвілі і Кутадзэлі** выехала ў **Гомель**, дзе наведае рад прадпрыемстваў.

З Гомеля пісьменнікі паедуць у Мазыршчыну.

СНК т. Галадзедам. Разам з грузінскімі пісьменнікамі — тт. Буачыдзе, Лордкіпанідзе, Гветадзе, Кутатэлі і Мосашвілі на прыёме ў Соўнаркоме былі і беларускія пісьменнікі — народныя паэты рэспублікі Янка Купала і Якуб Колас, старшыня праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі т. Клімковіч, тт. Александровіч, Лынькоў, Галавач, Чорны, Крапіва, Броўка і Шыклер.

Пасля выступлення т. Клімковіча грузінскі пісьменнік т. Буачыдзе падрабязна расказаў аб рабоце брыгады ў Беларусі.

— Ні ў якое параўнанне,—гаворыць т. Буачыдзе, — не ідзе беглае знаёмства з літаратурай БССР, якое мы атрымлівалі на пленумах і з'ездах, з той канкрэтнай і шчыльнай сувяззю, што адбываецца цяпер. Мы пазнаёміліся з творчасцю буйнейшых беларускіх пісьменнікаў, мы наладзілі з імі асабісты кантакт. Гэта — пачатак далейшай моцнай сувязі праз узаемную інфармацыю, перапіску.

Далей т. Буачыдзе гаворыць пра рост грузінскай совецкай літаратуры, пра жорсткую барацьбу з нацыяналістычнымі элементамі, для тэатра. А драматургія—самы даходчывы масавы жанр. Падняць драматургію на такую-ж вышыню, на якой знаходзяцца іншыя жанры літаратуры—важнейшая задача. А ў беларускай совецкай літаратуры проза і паэзія падняліся ўжо на высокую ступень і ўсё больш ідуць па шляху магутнага разгортвання, напрыклад, проза Галавача, Чорнага, Коласа, паэзія Александровіча, Броўкі, Янкі Купалы і іншых пісьменнікаў.

— Мы ганарымся нашымі літаратурнымі кадрамі. Літаратурная моладзь выраслa, узмацнела, «старыкі» памаладзелі. Янка Купала і Якуб Колас знайшлі новыя песні, спяваюць іх на поўны голас. Гэта таму, што яны ўнутрана пераконаны ў праўдзе таго, пра што цяпер спяваюць.

У канцы гутаркі тав. Буачыдзе, падкрэсліваючы на кіруючай ролі партыі ў развіцці совецкай літаратуры, гаворыць:

— У вялікай сям'і адчувае сябе совецкі пісьменнік. Ён бачыць, што літаратура ў нас — сапраўды агульнапралетарская, агульнадзяржаўная справа.

Тэарэтычна, навучыліся, як арганізоўваць масавую работу ў советах — заявілі курсанты.

У сваім выступленні тав. Чарвякоў спыніўся на задачах сельскіх советаў, райвыканкомаў інструктароў.

На развітанне курсанты запэўнілі тав. Чарвякова ў тым, што яны прыкладуць усе сілы, каб апраўдаць сябе на совецкай рабоце, аддана змагацца за справу партыі і рабочага класа. (БЕЛТА).

—o—

# Пабудуем новыя гіганты-самалёты

## УЗНОС НІНЫ БЕРАЗІНСКАЙ

Учора ў рэдакцыю «Звязды» з'явілася вучаніца 2 класа 4-й менскай школы імя Кірава **Ніна Беразінская** — дачка работніка Дзяржбанка. Ніна прынесла ў рэдакцыю 20 рублёў, якія прасіла перадаць у фонд пабудовы гігантаў-самалётаў.

10-гадовая Ніна ў вольны ад вучобы і гульняў час чытае газеты, яна ў курсе важнейшых падзей. Ніна з газет і з гутарак са сваякамі даведалася аб гібелі самалёта «Максім Горкі». У дзіцячай галоўцы наспела мысль — унесці сваю лепту на будаўніцтва самалётаў. Ніна ведае, што краіна будуе. Замест загінуўшага аднаго самалёта «Максім Горкі», новы вялікі атрад паветраных караблёў: яна пералічыла ўсе імёны, якія будуць насіць гэтыя караблі.

У мінулым годзе дзяўчынка падпісалася на 20 руб. на пазыку другога года другой пяцігодкі. Яе аблігацыя нядаўна выйграла і ўсю суму выйгрышу яна перадала на будаўніцтва самалётаў.

Ніна расказала з якімі разультатамі яна перайшла ў 3 клас. Яна мае тры «вельмі добра» і сем «добра».

—o—

## ЗЕЛЯНОЦКІ СЕЛЬСОВЕТ ДАЎ 4.000 РУБЛЁЎ

Працоўныя Зеляноцкага сельсавета, Дамanавіцкага раёна, шырока разгарнулі збор сродкаў на будаўніцтва новых самалётаў-гігантаў. Ініцыятарам збору сродкаў быў брыгадзір калгаса «Звязда» т. **Ілья Крот.**

Усяго на сельсавету сабрана 4 тыс. руб. Калгасы далі 1½ тыс. руб., рабочыя і служачыя — 1750 руб., працоўныя аднаасобнікі — 300 руб., вучні насовіцкай школы — 70 руб., астатнія 6 школ сабралі 380 руб.

**С. ЗАЙЦАЎ.**

## ПЕРАВЕДЗЕНА „ПРАВДЕ", 137 тыс. РУБЛЁЎ

Учора на пабудову самалётаў-гігантаў на рахунак «Правды» № 102, Беларускай канторай Дзяржбанка пераведзена 137 тыс. рублёў.

## НА БЯГУЧЫМ РАХУНКУ ДЗЯРЖБАНКА

На рахунак пабудовы самалётаў-гігантаў у Беларускай канторы Дзяржбанка па 31 мая (уключна) паступіла 137.100 руб.

Ад працоўных Бабруйска атрымана 19.517 руб., Віцебска — 12.764 руб., Шклова — 9.443 руб., Асіповіч — 3.580 руб., Дзяржынска — 7680 руб., Прапойска — 1071 руб., Ушач — 1032 руб.

Па Менску ўчора ўнеслі: кіно «Пролетарый» 159 руб., Беларускае таварыства глухіх 62 руб., Белсадвінпромтрэст — 183 руб., Белдрэў — 1100 руб., Белметалатрэст — 243 руб., Белсельгасснаб — 433 руб., транспартны трэст — 292 руб., Белдзяржкіно—280 руб., Белгалоўспірт — 525 руб., Белкалваласкно — 114 руб., дырэкцыя Белгандля 233 руб. і інш.

Усяго за ўчарашні дзень паступіла 58.168 руб.

*Па слядах выступленняў „Звязды"*

★

## „Васільеў адмаўляецца вучыць сваіх дзяцей"

Пашыранае пасяджэнне заўкома хімфармзавода ўстанавіла, што факты, указаныя ў «Звяздзе» ад 18 мая, цалкам пацвердзіліся.

Заўком адзначыў, што Васільеў увесь час запалохваў жонку, каб яна не хадзіла скардзіцца ў грамадскія арганізацыі, бо ён выедзе, скрыенца і тады яна ад яго не атрымае ні капейкі.

Каб ашукаць грамадскасць, ён заўсёды атрымліваў талоны на гарачае снеданне для сваіх дзяцей, у той час калі яны не вучыліся.

Васільева два разы выклікалі на заўком, але ён катэгарычна адмовіўся з'явіцца.

Заўком хімфармзавода імя Куйбышэва пастанавіў: «у звязку з тым, што грамадскасць завода на Васільева ўздзейнічаць не можа, справу аб ім перадаць у народны суд».

Рашэнне двух дзяцей Васільева ўспройць на дзіцячую школьную пляцоўку. Трэцяе дзіця Васільева пасадзіць у дом адпачынку.

Заўком даручыў свайму старшыні т. Элькіну накіраваць усіх трох дзяцей Васільева ў школу і аказаць ім матэрыяльную дапамогу для набыцця вопраткі і абутку.

—○—

## Па слядах неапублікаваных пісем

Тав. **Грэбеж** пісаў у рэдакцыю аб тым, што за крыўдку работы Віцебскага гарадскога аддзела аховы здароўя яго знялі з работы.

Віцебскі гаркам партыі паведаміле, што Грэбеж на рабоце адноўлен і за вымушаны прагул яму выплачана. Пытанне аб рабоце аддзела аховы здароўя будзе абгаворана на бюро гаркома партыі.

**

Настаўнік Пышнянскай школы, Лепельскага раёна, пісаў у рэдакцыю, што старшыня сельсовета

### Пісьмы з ільнаводчага раёна

# 4. МАШЫНЫ БЕЗ КАДРАЎ*)

Сяўба ільну, як ніколі, у Лёзненскім раёне закончана рана—26 красавіка. Пачалася праполка. Не за гарамі і ўборачная кампанія. Да яе трэба рыхтавацца ўжо сёння.

Вясна сёлета халаднаватая. Усходы паявіліся са спазненнем, затое пасля паяўлення лён узышоў вельмі дружна на ўсіх участках. Гэта значыць, што цяперашняе ільну трэба будзе правесці хутка і ў максімальна кароткі тэрмін. Ці трэба даводзіць, што машынізацыя ўборкі ільну будзе адыгрываць рашаючую ролю?

А тэхнічнае ўзбраенне ільнаводчай Лёзненшчыны з кожным годам расце і расце. У гэтым годзе на ільняных палях калгасаў раёна павінна працаваць 19 шыроказахватных ільноцерабілак ВНІІЛ-5 і 68 ільноцерабілак «Комсамолка». Гэта—вялізная тэхнічная сіла, якая пры правільным скарыстанні можа замяніць тысячы рабочых рук. **Ужо зараз трэба рыхтаваць такія кадры, якія-б змаглі ад гэтых машын узяць усё, што яны могуць даць.** А даць яны могуць шмат.

Некаторай увагай дырэкцыі МТС карыстаюцца толькі шыроказахватныя ільноцерабілкі ВНІІЛ-5. Яны сабраны на базу МТС, агледжаны, рамантуюцца. Пачата і падрыхтоўка кадраў для работы на гэтых машынах. Адзін месяц на курсах вучылася 17 чалавек; яны адпушчаны зараз у калгасы. На жаль, як гэтыя людзі авалодалі тэхнікай машыннага ільноцерабленя, ніхто ў МТС не ведае. Дырэктар МТС тав. Нартыш-Блук гаворыць, што яны павінны вучыцца яшчэ месяц, а намеснік па палітчасці тав. Сцепанюк лічыць, што ім ужо даволі вучыцца.

Аднак, гэтых 17 чалавек далёка недастаткова. МТС маркуе падрыхтаваць яшчэ чалавек 12. Калі пачнецца падрыхтоўка — невядома. Адно ясна, што ў Лёзненскай МТС яшчэ не ўявілі добра ўсё веліз нае значэнне падрыхтоўкі высокакласных кадраў. Аб гэтым гаворыць і такі факт.

Сёлета ў МТС павінна працаваць 68 ільноцерабілак «Комсамолка». Дзе кадры для гэтых машын? Яны распыліліся, іх не ведае МТС. Адны ільноцерабільшчыкі перакваліфікаваліся на трактарыстаў, другія пераходзяць на шыроказахватныя машыны. **МТС не ведае, дзе старыя кадры ільноцерабільшчыкаў,** а новых кадраў для «Комсамолкі» зусім не рыхтуе.

Неабходна зараз-жа знайсці ўсіх ільноцерабільшчыкаў мінулых год. Іх трэба сабраць на курсы, больш грунтоўна падрыхтаваць, каб усе ільноўборачныя машыны працавалі сёлета, як гадзіннік.

МТС не рамантуе машын. Ільноцерабілкі «Комсамолка» параскіданы па ўсіх калгасах зоны МТС. Вось калгас «1 з'езд саветаў», Стасеўскага сельсовета. У гразкай пуні тут стаіць чатыры «Комсамолкі». У іх пагнуты дышлы, адвінчаны гайкі, валяюцца розныя трубкі, балцікі. Дырэктар МТС т. Нартыш-Блук маркуе значную частку ільноцерабілак, замест рамонту, пусціць у ... дом.

Нас здзіўляе, чаму райком партыі, ведаючы аб недапушчальным становішчы машын і зрыве падрыхтоўкі кадраў, нічога не прадпрымае для забеспячэння механізаванай ільноўборкі. Мерапрыемствы райкома партыі па вырошчванню і выхаванню кадраў, вызначаныя ў сувязі з гістарычнай прамовай таварыша Сталіна, проста абыходзяць задачу падрыхтоўкі ільнаводчых кадраў.

Райком партыі пастанавіў правесці аднадзённыя курсы ільноцерабільшчыкаў і—трохдзённыя — на падрыхтоўцы намеснікаў старшынь калгасаў па ільну. І ўсё. Сушыльшчыкаў і мяльшчыкаў, трапальшчыц і сартыроўшчыкаў, відаць, у Лёзне рыхтаваць не збіраюцца.

**А. МІКУЦКІ.**
**М. РАШЫЦКІ.**

*) Гл. «Звязду» ад 27, 28 і 29 мая.

## АСУШВАЮЦЬ І АЧЫШЧАЮЦЬ СЕНАЖАЦІ

КРУЦКІ. На ініцыятыве старшынь атрымаць ліпніх 1200 цэнт

## ВЕСТКІ З ПАЛЁЎ

**(Ад карэспандэнтаў «Звязды» і БЕЛТА)**

**ВЕТРЫНА.** Рад калгасаў прыступілі да праполкі ільну. Калгас імя № дывізіі прапалоў першыя 8 гектараў. Інспектары па якасці ацэньваюць работу на «добра». Калгасніцы полюць лён босымі, супроць ветру. Пустазелле зносяць у адну кучу. Паміж звеннямі разгортваецца спаборніцтва на хутчэйшае праведзенне і высокую якасць праполкі.

**

**КРУГЛАЕ.** Пшаніца пачынае каласіцца. Але ў раёне аб праполцы не думаюць. Звенні палольчыц не арганізаваны. Паводле рашэння РК КП(б)Б трэба было падрыхтаваць больш 200 звенняўых. Але райза (загадчык **Фядотка)** і МТС (дырэктар **Станішэўскі)** мяркуюць арганізаваць курсы па падрыхтоўцы звенняўых толькі пасля 1 чэрвеня.

**ПЕТРЫКАЎ.** Многія калгасы асвойваюць новыя землі. Калгас **«Чырвоны будаўнік»,** Макарыцкага сельсовета, узараў 10 гектараў папару, асвоіў 13 гектараў новых зямель і асушыў 16 гектараў глебы. Калгаснікі арцелі **«Завет Ільіча»** ўзаралі 35 гектараў папару і асвоілі 8 гектараў новых зямель. Усяго па раёну новых зямель асвоена 92 гектары. На гэтых землях калгасы сеюць проса. Якасць ворыва, папару добрая.

**

**КРУПКІ.** Пералавыя калгасы адразу пасля сяўбы пачалі ворыва папару і цаліны. Ужо закончылі ворыва папару калгасы «Пабеда», «Звязда», «Колас», «Новая Нача».

Аднак, у многіх месцах панююць настроі аб тым, што папар араць яшчэ рана. Калгасы і аднаасобнікі Смародзінскага сельсовета ўзаралі толькі 53 гектары замест 326 па плану. У сельсавеце нават не ведаюць колькі калгасы павінны падняць папару і цаліны.

Па Сакаловіцкаму і Ухвальска-

У Менскім парку культуры і адпачынку. У выходны дзень.
Фотоэцюд КАПЛІНСКАГА.

## ЯК У „ЗАГАЛЛІ" ЗАХОУВАЮЦЬ УГНАЕННЕ

ЛЮБАНЬ. У луггас «Загалле» нядаўна завезлі 8 вагонаў каштоўнейшага ўгнаення—суперфасфату. Угнаенне было выгружана на станцыі Сосны пад адкрытым небам. Ішлі дажджы і суперфасфат ператварыўся ў гразь.

Праз некаторы час прыбыло яшчэ каля 12 вагонаў калійнай солі. Гэта ўгнаенне соўгас таксама выгрузіў на станцыі і ссыпаў на суперфасфат. Падвезены праз некалькі дзён калчаданны агарак раскінулі тонкім пластам па калійнай солі. Такім чынам з розначага роду ўгнаення зрабілі нейкую дзіўную змесь.

Пракуратура павінна расследаваць гэтую справу і прыцягнуць вінаватых да адказнасці.

—○—

## НА КАНЮШНІ АРУДУЮЦЬ КУЛАКІ

У калгасе «Чырвоны бор», Гілянскага сельсовета, Чашніцкага раёна, пятавая сіла знаходзіцца ў дрэнным становішчы. Тут коні абязлічаны, на іх кожны дзень

## КАНДЫДАТЫ НА ПРАВА ПАДПІСАЦЬ РАПАРТ НАШАМУ ВЯЛІКАМУ ПРАВАДЫРУ ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

**Па прадстаўленню райкомаў партыі і райвыканкомаў заносім у спіс кандыдатаў наступных таварышоў:**

**КАПЫЛЬСКІ РАЁН:**

59. **Мастовіч.** Брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Чырвоны папранічнік», Лашнянскага сельсовета. Беспартыйны. Брыгадзірам працуе з 1929 года. Брыгада выдзякавана скончыла сяўбу 5 мая. Па яго ініцыятыве ва ўсім калгасе разгорнута спаборніцтва калгасных брыгад. За ўзорную работу не раз прэміраваны.

60. **Галінскі.** Старшыня калгаса імя Блюхера, Пацейкаўскага сельсовета. Член КП(б)Б. Калгас з адстаючых вышаў у перадавыя. Спаборніцтва арганізавана ва ўсіхкалгасных брыгадах. За час веснавой сяўбы выпушчана 11 нумароў калгасных насценгазет. Ва ўсіх брыгадах арганізавана сістэматычнае чытанне газет.

61. **Маеўскі.** Старшыня Быстрыцкага сельсовета. Член КП(б)Б. Дэлегат XI усебеларускага з'езда саветаў. Сельсавет першым у раёне скончыў сяўбу. Ва ўсіх калгасах і брыгадах разгорнута спаборніцтва калгасных брыгад і паход за лён імя **Гікало.** Сельсавет атрымаў пераходны сцяг райкома КП(б)Б і райвыканкома.

62. **Арабей.** Брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Пралетарый», Пацайкаўскага сельсовета. Брыгада першай у раёне скончыла на «выдатна» сяўбу, за што атрымала пераходны сцяг Капыльскай МТС. У брыгадзе рэгулярна праводзяць чытанне газет. За час сяўбы выпушчана 20 насценгазет.

**СЛУЦКІ РАЁН.**

63. **Кедыш Яззп.** Старшыня калгаса «Калектывіст», Ісарскага сельсовета. На тэтай пасадзе працуе 5 гадоў. Былы батрак. Член КП(б)Б. Сяўбу ільну на лепшых папярэдніках скончыў 15

законнасць.

Бюро Лепельскага райкома партыі паведамляе, што факты, указаныя ў пісьме, пацвердзіліся: старшыня сельсавета Занько за грубае парушэнне рэвалюцыйнай законнасці знят з работы і выключан з партыі.

***

Тав. **Качан** пісаў, што ў сталовай **Ушацкага** гарпо брудна і што загадчык сталовай і буфетчык п'янствуюць.

Ушаўнаўзаканы ЦСПСБ па Ушацкаму раёну паведамляе, што факты, указаныя ў пісьме, пацвердзіліся. Загадчык сталовай, буфетчык і рахункавод за п'янку, антысанітарнае становішча сталовай, за заблытанасць уліку з работы знят.

***

Сялькор П. А. паведамляў, што рахункавод калгаса «Чырвоныя Барыскавічы», Прускага сельсавета, **Крывіцкі** знішчае цялят.

Мазырскае райза паведамляе, што факты пацвердзіліся. Крывіцкі выведзен з складу прэзідыума сельсавета і аддан пад суд. Райкомам КСМ Крывіцкі выключан з радоў комсамола.

Прэзідыум Мазырскага райвыканкома зняў з работы старшыню Прускага сельсавета **Ландо** за страту класавай пільнасці.

□ □ □ □ □ □

Калгас «Апора советаў», Лёзненскага сельсавета і раёна, закончыўшы вясновую сяўбу і выканаўшы план дзяржаўнага дарожнага будаўніцтва, пачаў рамантаваць праселачныя дарогі, якія праходзяць праз калгас. У кожнай брыгадзе калгаса выдзелена па аднаму звяну з 6 коп. Гэтыя звенні прыкопваюць канавы, абапал праселачных дарог, рэгулююць палатно, прыводзяць дарогі ў культурнае становішча. Бяручыстыя месцы робяцца праезджымі.

Фота А. МІКУЦКАГА.

шыні калгаса «Чырвоны Бор» Зянько разгарнуліся работы па асушэнню і ачыстцы сенажацей. Ачышчана ад хмызняку 15 гектараў сенажацей. Калгаснікі мяркуюць высокаякаснага сена.

У калгасе «Шлях соцыялізма» ачышчана ад хмызняку больш 10 гектараў сенажацей. У калгасе імя Чарнякова асушана і раскарчавана 2 гектары балотнай глебы.

му сельсоветах план зрыва папараў выканан на 4—8 проц.

У раёне адкладваюць зрыва папару, у выніку чаго іх узарана менш пятай часткі, а цаліны паднята толькі 25 гектараў.

працуюць новыя людзі. У выніку гэтага адзін конь паў, скалечана племянная кабыла, астатнія 34 коней ледзь ходзяць.

На канюшні беспакарана арудуе група кулакоў на чале з Кажарскім Васілём. **Я. МІКУЛЬСКІ.**

# КАЛГАСНАМУ ПАСТУХУ—КЛОПАТЫ І УВАГУ

## НАРАДА МАЙСТРОЎ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

Цэнь фруктовага саду гасцінна прыпусціў калгасных пастухоў, якія сабраліся сёння па запрашэнню рэдакцый «Звязды» і раённай газеты «Камунар» ў мястэчка Ціхінічы, Рагачоўскага раёна на злёт майстроў социялістычнай жывёлагадоўлі. Пастух калгаса «Авангард» **Барыс Платонаў**, разгладжваючы сваю сівую бараду, прагаварыў:

— Даўно мяне тут не было. Пастуха раней за чалавека не лічылі, а цяпер, паглядзі—нават на спецыяльную канферэнцыю запрашаюць.

— Верна, дзед, кажаш,—падтрымалі яго галасы з-за кустоў:— пастух — гэта гаспадар стада.

З вялікай увагай удзельнікі злёта заслухалі даклад загадчыка раённага земаддзела т. **Змушко** аб задачах у развіцці жывёлагадоўлі, аб стварэнні кармовай базы.

Пасля дакладу першае слова атрымаў пастух **Владзімір Плесанаў.** У зімовы перыяд ён даглядае кароў, а летам — пасе. Яго выступленне, гэта—апавяданне аб барацьбе за социялістычную жывёлагадоўлю, апавяданне аб багатым вопыце.

— Важна не толькі кармленне скаціны,—гаворыць ён, — але і вадапой. Скажам, калі карова не п'е вады з адной студні, напаі яе з другой. Пасьбу арганізаваць трэба. Летам я пасу кароў такім чынам: у мяне пасьбішча разбіта на 4 участкі. На адным пасу, а на астатніх траву гадую. Каровы наядаюцца і даюць добры ўдой малака.

Пастух калгаса «Новае жыццё» **Сталяроў** гаворыць:

— Пасвіць карову трэба ў сырое надвор'е супроць ветру, бо на ветру ў такое надвор'е каровы бяруць, топчуць траву і не наядаюцца.

Гаворыць стары **Барыс Платонаў.** Яго стаж пастуха—40 год.

— Пастух павінен любіць сваю справу,—гаворыць ён.—Сваё пасем, а не панскае. А ёсць такія пастухі, у якіх многа добрай пашы, а каровы худыя і малака не даюць. Дрэнны пастух можа за дзень стравіць усю плошчу, адведзеную пад пашу...

— Вось якраз у нас такі пастух,—перарывае яго даярка калгаса «Друць» т. **Музычэнка.**— Пастухом у нас паставілі Шарапава таму, што ён мала на палявых работах зарабляе, бо гультай.

Выступаўшыя пастухі і даяркі крытыкавалі асобныя праўленні калгасаў за дрэнныя адносіны да жывёлагадоўлі. Пастухі і даяркі прывялі многа прыкладаў агідных адносін да жывых людзей, да лепшых ударнікаў жывёлагадоўлі.

Гаварылі таксама аб недахопцы пасеву кармовых траў. Асабліва дрэнна абстаіць справа ў калгасе «Звязда». Там мала пасьбішча. Старшыня-ж калгаса Антонаў нічога не зрабіў для выканання плана пасеву кармовых траў. Каровы ў калгасе худыя. Злучная кампанія сарвана.

Удзельнікі злёта прад'явілі вялікія патрабаванні да сябе і да іграўнікоў калгасаў і раённых арганізацый. У сваім рашэнні яны патрабавалі павялічэння плошчы пад пасеў кармовых траў, паляпшэння пасьбішчаў, стварэння лепшых умоў для работы пастухоў, даглядчык і даярак. Яны абяцалі лепшы вопыт пасьбы і догляду перавесці ва ўсе калгасы.

**А. МАНЬКОЎ.**
**Г. ВЯРХОЎСКІ.**

## АБ ПАСТУХАХ

ШКЛОЎ. **(Вагон-рэдакцыя «Звязды»).** Досвіткам пастух **Хомка Гаверкоў** выганяе на пасьбішча калгаснае стада. Гаспадарскім вокам ён аглядае жывёлу, пяшчотнай рукой гладзіць рэкардыстак і любуўна, без крыку, загадвае:

— Пашлі ў поле.

Стада разышлося па пасьбішчу. Хомка Гаверкоў не зводзіць з яго вачэй. Ён пільна сочыць за тым, каб адна карова не калола другую, мацнейшыя не заганялі слабейшых.

Хомка любіць і ганарыцца сваёй работай. Ён ведае, што калгас даверыў яму, як члену праўлення, лепшаму ўдарніку гэты адказнейшы ўчастак.

Пастухом Гаверкоў працуе другі год. Ён скончыў завочныя курсы па жывёлагадоўлі, добра аўладаў тэхнікай сваёй справы. Яго ў калгасе **«Серп і молат»,** Александрыйскага сельсавета, лічаць першым чалавекам.

Хомка Гаверкоў правільна арганізаваў пасьбу жывёлы. Пасьбішча разбіта на тры ўчасткі. Кожны ўчастак спасваецца па чарзе. Дойныя каровы падпасваюцца на лепшых пасьбішчах.

І не дзіўна, што дзенны ўдой ад кожнай каровы ён давёў да 12 літраў. Гаверкоў лічыць гэта яшчэ недастатковым. Ён паставіў задачу давесці штодзённы ўдой каровы да 18 літраў малака ў дзень.

Крыўдна пастуху калгаса **«Спартак»,** Фашчэўскага сельсавета, **Андрэю Міхалюта.** Ён ужо чацверты тыдзень з жывёлай на выпасах, а праўленне калгаса нават не ведае, дзе Міхалюта пасе жывёлу. Стада вялікае, а пастухом пастаўлен толькі ён адзін. Падпаскі штодзённа мяняюцца.

Міхалюта не водае, колькі ён сыпраноўвае працадзён. З гэтым хвалюючым пытаннем ён не раз зварочваўся да старшыні калгаса **Сараковіча** і кожны раз чуў адзін адказ:

— Пасі пакуль што, а там пабачым.

Такія адносіны да пастуха і ў калгасе **«Орка»,** Чарнянскага сельсавета.

У вагон-рэдакцыю «Звязды» прышоў старшы пастух гэтага калгаса **Віктар Чахоўскі.** Ён з абурэннем расказаў аб тым, як безадказна і нядбайліва старшыня калгаса **Аляхновіч** адносіцца да пасьбы жывёлы.

Аб пасьбішчах ніхто не клапоціцца. На адным і тым-жа пасьбішчы пасуцца дойныя каровы, маладняк, авечкі і нават свінні.

Такіх скаргаў пастухоў у раёне многа. Яны законныя і невыпадковыя. У большасці калгасаў раёна размовы аб пастухах былі толькі тады, калі трэба было выганяць жывёлу ў поле. Папярэдні падбор і абмеркаванне кандыдатур пастухоў, як правіла, на праўленнях калгасаў і агульных сходах не праводзілася.

Пасля гэтага не выпадкова, што ў калгасе імя Сталіна, Уланаўскага сельсавета, пасвіць калгасную жывёлу даручылі аднаасобніку Казлову. У калгасе імя Валадарскага, Рыжкаўскага сельсавета, пастухамі вылучаны 70-гадовы дзед Гаўрусёў і інвалід Дземідзенка. 13-гадовыя хлапчукі вызначаны старшымі пастухамі ў калгасах імя Кірава, «Чырвоныя паляны» і «Працаўнік».

Пасьбішчны перыяд—адказнейшы ў павышэнні прадукцыйнасці жывёлагадоўлі. Тут вялікую ролю адыгрывае пастух. Гэта нарэшце павінна зразумець кіраўніцтва раёна.

**А. ЛОСЬ, Л. РАГІНСКІ.**

## За культурныя раённыя цэнтры

# КАНТРАСТЫ

Лозунг вялікага і мудрага правадыра народу таварыша **Сталіна** аб заможным і культурным жыцці глыбока запаў у сазнанне шырокіх калгасных мас.

Амаль кожны дзень у рэдакцыю смалявіцкай раённай газеты паступаюць карэспандэнцыі аб упарыгожанні хат калгаснікаў, прывядзенні ў чысты і культурны выгляд двароў і вуліц, аб азеляненні вёсак.

Па ініцыятыве калгаснікаў калгаса **«Полымя»** (Клянічкі сельсавет) у вёсцы Клянік будуецца клуб, які ўмесціць не менш 300 глядачоў, з асобнай чытальняй і бібліятэкай.

У **Забалоцкім** сельсавеце будуецца клуб на 400 глядачоў з асобнай чытальняй і бібліятэкай. Пачата пабудова лазні з мужчынскім і жаночым аддзяленнямі і цырульняй.

Шырока разгорнута культурнае будаўніцтва ў **Слабадскім** і **Пліскім** сельсоветах.

Пры МТС зроблена пасадка дрэў над парк культуры і адпачынку з алеямі. Падрыхтоўваецца пабудова фізкультурнай пляцоўкі.

Калгаснікі пачалі наводзіць парадак і чыстату ў сваіх хатах. Калгаснік сельгасарцелі імя Варашылава **Іван Лашук** аклеіў сваю хату абоямі, зрабіў перагародкі. Лашук мае цяпер прыгожую спальню, сталовую і кухню. Калгаснік **Владзімір Яўменчык** зняў з кута абразы, аклеіў хату абоямі, зрабіў перагародкі, на вокны павесіў занавескі. Яго дзеці завялі ў хаце кветкі. Тав. **Конва,** з калгаса імя Чарнякова, мае хату без драўлянай падлогі, але падлога штодня намазваецца глінай, хата аклеена абоямі, на вокнах павешаны занавескі і заведзены кветкі. Старшыня калгаса «Чырвоны баец» т. **Ядрыянаў** сваю хату ўпрыгожыў кветкамі, аклеіў абоямі і набыў бібліятэчку, швэйную машыну. Многа калгаснікаў, не гаворачы ўжо аб калгасным актыве, зняді ў хатах абразы, на сценах з'явіліся карціны, партрэты правадыроў партыі

Аднак, раённы цэнтр—мястэчка Смалявічы ўяўляе сабой рэзкі кантраст таму, што адбываецца зараз у калгасах.

На совецкай вуліцы тратуары ў жудасным становішчы. Пабудаваны яны крывымі лініямі рознай шырыні. У цёмную ноч па тратуарах трэба хадзіць вобмацкам, з вялікай асцярожнасцю, бо яны паламаны. На астатніх вулідах тратуары знаходзяцца яшчэ ў горшым становішчы. Двары ў большасці забруджаны рознымі нечыстотамі. Лазня, якая ёсць у мястэчку, знаходзіцца ў антысанітарным становішчы. У памяшканнях большасці раённых устаноў брудна (да рэчы, да такіх устаноў адносіцца і РВК).

Не дзіўна, што часта прыходзіцца чуць ад калгаснікаў, што ў «раёне не адчуваецца культуры, у нас, у калгасе, куды лепш».

Аб тым, што раённыя арганізацыі, у першую чаргу РВК і яго аддзелы—райана і райкомгас, не займаюцца пытаннем культурнага будаўніцтва ў цэнтры раёна, сведчаць такія факты. На працягу шасці месяцаў знаходзяцца на замку Дом соцкультуры, бібліятэка і чытальня. Да рамонту гэтых памяшканняў і зараз яшчэ не прыступілі і ў бліжэйшы час прыступаць не думаюць. У мястэчку няма пляцовак для рознага віду спорту, не разгорнута мастацкая самадзейнасць. І гэта ў той час, калі ў Смалявічах ёсць досыць значныя культурныя сілы.

Знікла старая вёска з яе царквой, дамамі папа, кулака і кабаком на першым плане. На іх месцы вырастаюць новыя вёскі, з Дамамі соцкультуры, калгаснымі фермамі, лазнямі, прыгожымі культурнымі хатамі калгаснікаў. Але асталося яшчэ брудпае, некультурнае мястэчка Смалявічы. У чымжа прычына, т. **Хадаркевіч,** старшыня Смалявіцкага РВК?

**Калектыўны карэспандэнт «Звязды» — раённая газета «ШЛЯХ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ».**

## Унутрыпалітычнае становішча ва Францыі

# ЗАКОНАПРАЕКТ АБ НАДЗВЫЧАЙНЫХ ПАЎНАМОЦТВАХ

ПАРЫЖ, 29 мая. Выступіўшы ў палаце дэпутатаў міністр фінансаў **Жэрмен Мартэн** пацвердзіў, што дэфіцыт бюджэта неспрыяюча адбіваецца на становішчы франка. Ён указаў, што за апошні час уцечка золата склала ў сярэднім 1 млрд. у дзень. Урад, — заявіў Жэрмен Мартэн — не намеран прыбягаць к дэвальвацыі (абясцэненню франка) для пакрыцця бюджэтнага дэфіцыту. Гэты дэфіцыт павінен быць пакрыт мерамі жорсткай эканоміі расходаў, для чаго ўрад і патрабуе надзвычайных паўнамоцтваў.

У парламенцкіх колах аднадушна лічаць, што сёння будзе вырашан лёс урада Фландэна, і што яго становішча вельмі сур'ёзнае, калі ўлічыць халодны прыём, аказаны выступленню Жэрмен Мартэна і атмасферу ў парламенцкіх кулуарах.

На пасяджэнні фракцыі радыкалаў прынята рашэнне ў карысць шырокага саюза з усімі рэспубліканцамі для абароны франка і дэмакратычных свабод. На думцы дэпутата Далад'е, даве трэці радыкалаў — супроць прадастаўлення ўраду паўнамоцтваў.

Камуністычная і сацыялістычная фракцыі палаты дэпутатаў звярнуліся да радыкал-сацыялістаў і раду левых груп палаты з прапановай наладзіць 30 мая сумесную нараду для ўзгаднення дзеянняў, накіраваных супроць патрабавання ўрада. («Известия»).

***

ПАРЫЖ, 29 мая. (ТАСС). Фінансавая камісія французскай палаты дэпутатаў большасцю 25 чалавек супроць 15 выказалася **супроць прадастаўлення** ўраду надзвычайных паўнамоцтваў. У палітычных колах лічаць, што **адстаўка габінета немінуча.**

***

ПАРЫЖ, 30 мая. (БЕЛТА). У сувязі з наспяваючымі тут падзеямі, асаблівай увагі заслугоўвае той факт, што радыкал-сацыялісты і астатняя левыя групы палаты **адказалі згодай** на прапанову камуністаў і сацыялістаў аб выпрацоўцы **сумесных дзеянняў** у палаце і выдучылі сваіх прадстаўнікоў для ўдзелу ў нарадзе левых груп.

# ПЕРАД ВОТУМАМ НЕДАВЕР'Я

ПАРЫЖ, 31 мая. (БЕЛТА). Учарашняе пасяджэнне палаты дэпутатаў пачалося ў атмасферы, вельмі неспрыяльнай для ўрада.

Правыя напракалі ўрад у нерашучасці ў адносінах да камуністаў і сацыялістаў, на якіх правыя прабавалі ўзваліць адказнасць за фінансавую паніку, выкліканую вібы-та выбарчымі поспехамі гэтых партый.

Сяратнік Тардзе **Рэйно** заявіў, што ён—прыхільнік дэвальвацыі, але дэвальвацыю нельга правесці, калі краіна і біржа ахвачаны панікай. Рэйно зрабіў рад выпадаў супроць міністра фінансаў Жэрмен Мартэна, у выніку чаго Жэрмен Мартэн падаў неадкладна ў адстаўку, не чакаючы пасяджэння габінета.

Фландэн тлумачыў фінансавую паніку вынікам міжнароднай спекуляцыі. Ён абяцаў прыняць энергічныя меры супроць спекулянтаў і, у прыватнасці, устанавіць кантроль над узяццем золата з французскага банка. Ён сцвярджаў, што ў выпадку падзення яго габінета, будучае міністэрства немінуча вымушана будзе правесці дэвальвацыю франка, што будзе катастрофай для краіны.

У начным пасяджэнні палаты выступіў **Эрыо**, абараняўшы законапраект аб прадастаўленні ўраду надзвычайных паўнамоцтваў. Выступіўшы ўслед за Эрыо другі прадстаўнік радыкалаў **Боннэ** заявіў, што большасць радыкалаў не гласуючы на павагу да Эрыо, будзе галасаваць супроць урада.

Пасля выступлення камдэпутатаў **Раметта** і **Торэза** ў 2-й палавіне ночы палата прыступіла да галасавання. Супроць урада галасавалі палкам фракцыя комуністаў, сацыялістаў і неасацыялістаў і пераважная большасць радыкалаў. (114 з агульнага ліку 160).

—○—

# АДСТАЎКА ФРАНЦУЗСКАГА ЎРАДА

ПАРЫЖ, 31 мая. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе, што пасля абмеркавання ў палаце дэпутатаў пытання аб прадастаўленні ўраду надзвычайных паўнамоцтваў, якое закончылася адхіленнем праекта аб надзвычайных паўнамоцтвах большасцю 353 супроць 202, урад **Фландэна** падаў у адстаўку.

ПАРЫЖ, 31 мая. (БЕЛТА). Прэзідэнт рэспублікі Лебрэн даручыў фармаванне новага габінета міністраў старшыні палаты дэпутатаў **Бюісону.** Прапанова прынята.

# ЯПОНСКІ УЛЬТЫМАТУМ КІТАЮ

# Прылёт чэхаславацкай ваеннай дэлегацыі

МАСКВА, 31 мая. (БЕЛТА). 30 мая ў Маскву на 2-маторным самалёце «Блох-200» прыляцела чэхаславацкая ваенная авіяцыйная дэлегацыя на чале з начальнікам ваеннай авіяцыі Чэхаславакіі генералам **Файфр.** У складзе дэлегацыі — кіраўнік аддзела авіяцыі міністэрства абароны палкоўнік **Віхерэк,** кіраўнік аддзела авіяцыйных матэрыялаў міністэрства абароны палкоўнік **Кейла** і камандзір 4 лётнага палка падпалкоўнік **Бероўнскі.**

Экіпаж самалёта складаецца з 4 чалавек: навігатара-обер-лейтэнанта **Шкопа,** пілота-лейтэнанта **Спурнага,** механіка і радыста.

На цэнтральным аэрадроме ў Маскве чэхаславацкай авіяцыйнай дэлегацыі была аказана ўрачыстая сустрэча. На аэрадроме былі вывешаны чэхаславацкія і савецкія сцягі. На лётным полі выстаўлены ганаровы караул з курсантаў школы спецыяльных служб паветраных сіл РСЧА.

Вышаўшага з самалёта генерала Файфр вітаў начальнік паветраных сіл РСЧА т. **Алксніс.** Затым генерал Файфр прыняў рапарт начальніка ганаровага караула і разам з тт. Алкснісам, Хрыпіным і іншымі прайшоў уздоўж фронта ганаровага караула і прывітаўся з курсантамі. Аркестр выканаў чэхаславацкі нацыянальны гімн і «Інтэрнацыянал».

Пасля гэтага ганаровы караул прайшоў урачыстым маршам міма генерала Файфр і сустракаўшых.

Перад мікрафонам «Саюзкінохронікі» генерал Файфр сказаў кароткае прывітанне, у якім заявіў, што ўрад Чэхаславакіі даручыў дэлегацыі засведчыць прыязныя пачуцці, якія чэхаславацкая ваенная авіяцыя адчувае да савецкай авіяцыі. З аэрадрома чэхаславацкая дэлегацыя накіравалася ў гатэль «Нацыянаў».

—○—

# Пераможнае наступленне Кітайскай Чырвонай арміі

ТОКІО, 31 мая. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Сімбун рэнга ле гледзячы на ўсе спробы кіруючых персанальна Чан Кай-шы нанкінскіх войск спыніць наступленне кітайскай Чырвонай арміі ў правінцыі Сычуань, Чэнду, зноў над пагрозай наступаючай з 3-х бакоў кітайскай Чырвонай арміі. 50-тысячная Чырвоная армія пад камандаваннем Чжу Дэ і Мао Цзэдуна на днях заняла Юэцзюнь у паўднёва-заходняй частцы Сычуана, а затым дасягнула ракі Дадухэ. Зараз гэтыя часці ўпарта атакуюць 24 нанкінскую армію. У той-жа час наступаючая з поўначы кітайская Чырвоная армія Сю Сянь-цзяня дасягнула Веньчуанью, у 60 мілях на поўнач ад Чэнду. З захаду на Чэнду наступаюць войскі Лю Сян, якія ўжо ўзялі Гуанюань і Гуанхань.

# СПРАВА АБ ЗЛАЧЫНЦАХ ГАРАЦКАГА ІНСТЫТУТА*)

ГОРКІ, 31 мая. **(Спец. кар. «Звязды»).** Суд прыступіў да разбору справы былых кіраўнікоў Гарацкага сельскагаспадарчага інстытута **Барысевіча, Іезуітава, Фільянава, Шасцярнёва** і інш. Гэтыя людзі, маючыя вышэйшую асвету, свядома зрывалі падрыхтоўку да 1934-1935 навучальнага года, займаліся очкаўцірацельствам і ашуканствам.

У той час, як да пачатку навучальнага года было падана ўсяго 6 заяў на прыём у інстытут, кіраўнікі інстытута выехалі на курорт, яны не звярнулі нават мінімальнай увагі на паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў студэнтаў. Частка студэнтаў не мела інтэрната, а Барысевіч заняў 7 пакояў пад авёс. Былое кіраўніцтва актыўна абараняла контррэволюцыйных трацкісцкіх элементаў — іназемцава, Аліванава, Усцінава і інш. Гэтым контррэволюцыянерам нават выдаваліся хлебныя атэстацыі.

Спецыяльныя стаўкі ўстанаўляліся без усякай падставы, асістэнты пераводзіліся ў дацэнты, а апошнія ў прафесары. На зарплаце толькі за адзін год перарасходавана больш 119 тыс. руб. Гэту суму пакрывалі незаконнымі пераводамі спецыяльных сродкаў з вучобнай гаспадаркі.

Сродкі на харчаванне хворых студэнтаў выкарыстоўваліся на паноўкі, на непатрэбныя камандыроўкі.

Усё гэта рабілася свядома, з адзінай мэтай — сарваць нармальную работу інстытута. Вучэбная гаспадарка праваліла падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Былы дырэктар інстытута Барысевіч груба зажымаў крытыку.

Суду далі паказанні агранам **Мартынаў,** загадчык рабфака **Трахімовіч,** былы дырэктар вучэбнай гаспадаркі **Вашкевіч,** бухгалтар **Корабаў.**

Над перакрыжаваным допытам суд выяўляе рад новых фактаў, паказваючых невыпадковае з'яўленне ў інстытуце групы контррэволюцыянераў-трацкістаў. **Іезуітаў** быў старым прыяцелем Аліванава, ён ведаў, што Аліванаў выключылі з партыі, як варожага нам чалавека, ён ведаў аб контр-

# *Насустрач сонцу*

**(Гарадская эстафета імя „Комсомольской правды")**

Фізкультурнікі-калгаснікі калгасаў імя Дзяржынскага і «Ленінскі шлях», Мінскага раёна, удзельнікі эстафеты імя «Комсомольской правды». Фота КАПЛІНСКАГА.

□ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □ □

Калі зайграў аркестр, на зялёнае поле стадыёна «Профінтэрн» выйшлі на парад усе каманды — удзельнікі эстафеты імя «Комсомольской правды».

Упершыню калгаснікі аспрэчваюць гаралское пярэшынства.

Старт. У першым забегу ідуць каманды «Большэвіка», БДУ і інш. Стартуюць лежачы, дакранаючыся грудзьмі да зямлі. Лепшы старцёр рэспублікі тав. **Шэрашэўскі** апускае чырвоны сцяжок і камандуе: «Марш!».

Пабеглі. Першая перашкода — канава; не лёгка пераскакваюць бегуны потым яны паўзуць пад сетку, скачуць праз бар'еры, выбягаюць за вароты ў сад. Ля ракі іх чакае змена. Новыя бегуны атрымліваюць эстафетную палачку і ў брод праз раку, са свежымі сіламі, прадаўжаюць бег. Мужчыны змяняюць жанчыны, зноў ідуць мужчыны з вінтоўкамі, потым веласіпедысты, мужчыны з супроцьгазамі. Эстафета перадаецца зноў жанчынам. Іх хутка змяняюць мужчыны і ўжо на стадыёне апошнім, адзінаццатым этапам, зноў бягуць на 500 метраў жанчыны. Яны фінішыруюць.

Першы забег выігравае каманда № 2 тэхнікума фізкультуры. Гэты забег прыносіць першую радасць. Каманда прайшла ўвесь маршрут—14.500 метраў — за 30 мінут 59 секунд. У мінулым годзе лепшы вынік эстафеты быў 31 мінута 08 секунд.

У другім забегу бягуць больш моцныя каманды. Каманда №-ската палка ставіць новы рэкорд — 29 мінут 48,6 секунд.

Старцёр зноў падняў над галавой сцяжок: «Увага!». На старце — мацнейшыя каманды сталіцы. Сцяжок апусціўся. Бегуны пашлі. Упершыню студэнт тэхнікума фізкультуры **Карл Гаўсман.** Але над сеткай ён крыху замарудзіў. Лепшы спрынтар Менска **Барыс Левінсон** (каманда «Спартак») рэзка вырываецца ўперад, лёгка пераможвае праз бар'еры, праносіцца куляй па полю і знікае ў алеях саду. Першы этап выігравае каманда «Спартак».

Лёгка прайшоў 3.000 метраў студэнт медыцынскага інстытута **Эрнест Яўнайс,** які пядаўна заваяваў у кросе імя Шверніка другое месца. Ён бяжыць па-майстэрску. Такога стылю, бадай, ні ў аднаго бегуна Менска яшчэ не было. Для трыумфатара пярэшынства тав. **Іванова** гэта сур'ёзны «праціўнік».

...На бегавой дарожцы стадыёна бяжыць тав. **Анісімава.** Па нумары на ёй пазнаюць каманду будаўнікоў. Яна першай ідзе істужку фінішу. Час—28 мінут 14,8 секунд. Студэнтка медінстытута тав. **Грыневіч** прыходзіць другой — 28 мінут 43,2 сек., а каманда № 1 тэхнікума фізкультуры, два гады трымаўшая пярэшынства ў эстафеце імя «Комсомольской правды», выходзіць на трэцяе месца. Результат гэтай каманды — 29 мін. 15 сек.

Даволі ўдала дэбютавалі калгаснікі Міншчыны. Строчыцкая каманда заняла дзевятнаццатае месца, самахвалавіцкая — дваццатае, пакінуўшы ззаду сябе 15 гарадскіх калектываў.

Сёлета 6 каманд прайшлі маршрут хутчэй, чым лепшыя каманды ў мінулым годзе. Першы пераходны прыз імя «Комсомольской правды» заваявала каманда будаўнікоў (інструктар тав. **Біргер**). Другі прыз—каманда медінстытута (інструктар т. **Дароўскі**).

**І. ЦЫВЕС.**

# ЗДАБЫЧА ТОРФУ

**(Па заводах Белторфа)**

**Здабыта ў тонах**

| 29 мая | 30 мая |
|---|---|
| 4559 | 4650 |

# АБВАЛ СЦЯНЫ НА БУДАЎНІЦТВЕ НОВАЙ ШКОЛЫ

29 мая вечарам на будаўніцтве новай школы па Грушаўскай вуліцы па скончэнні цагельнай кладкі абвалілася сярэдняя частка 4-паверховай сцяны. Афіцыянта няма. Рабочыя ў гэты час знаходзіліся ў цэлы працы з боку кіраўніцтва Менбуда.

На пастанове прэзідыума горсавета Гінзбург і Есяндзоў зняты з работы. Менбуду прапанавана

## АКУПАНТЫ ПАГРУЖАЮЦЬ ЗАЯЦЬ БЕЙПІН І ЦІНЬЦЗІНЬ

ТОКІО, 30 мая. (БЕЛТА). Згодна паведамлення японскай газеты «Ніці-ніці», японскі ваенны агент у Бейпіне **Такахесі** пасля паездкі ў Нанкін да намесніка старшыні палітычнага совета ў Бейпіне Ван-Кеміна і японскага ваеннага міністра Хо Ін-ціна апублікаваў заяву, у якой указана, што ўзросшы ліх кітайскіх загатовак у Манчжоў-го, дапамога японскім Суп Юн-цзіна (партызаны) у дэмілітарызаванай зоне і тарарыстычныя акты ў Чаньчуні (забойства двух японафільскіх рэдактараў) парушаюць пагадненне ў Тангу і «адлюстроўваюць антыяпонскую палітыку Чан Кай-шы».

«Самым сур'ёзным, — гаворыцца далей у заяве, — з'яўляецца тое, што базы тэтай дзейнасці —ў Бейпіне і Цяньцзіне, і таму, калі кітайскія ўлады не зменяць становішча ў Паўночным Кітаі, японскія войскі будуць вымушаны ў поўнай перайсці Вялікую сцяну і ўключыць Бейпін і Цяньцзін у дэмілітарызаваную зону».

Выкліканы ў Чаньчунь генерал **Удзу**, камандуючы японскімі войскамі ў Паўночным Кітаі, зрабіў даклад японскаму ваеннаму міністру **Хаясі**, які знаходзіцца зараз у Чаньчуне. Мінамі (японскі пасол у Манчжоў-го і камандуючы Квантунскай арміяй) аб становішчы ў Паўночным Кітаі.

Квантунская армія рашыла заняць пэўрдую пазіцыю ў вырашэнні канфлікту ў Паўночным Кітаі, прычым Хаясі падтрымлівае пазіцыю Квантунскай арміі.

***

ШАНХАЙ, 30 мая. (БЕЛТА). Учора начальнік штаба японскіх войск Паўночнага Кітая палкоўнік **Сакаі** і японскі памочнік ваеннага аташэ у Бейпіне падпалкоўнік **Такахасі** перадалі **Хо Ін-ціну** (ваенны міністр нанкінскага ўрада і старшыня бейпінскага аддзялення Нанкінскага ваеннага совета) новы ультыматум Квантунскай арміі, у якім патрабуюць акупацыяй Бейпіна і Цяньцзіна.

## Перадача румынскіх дзяржаўных архіваў

31 мая закончылася перадача Цэнтраархівам упаўнаважаным румынскага ўрада румынскіх дзяржаўных архіваў, эвакуяваных у часе вайны ў 1914—1918 гг.

Пасля сканчэння перадачы загадчык 2-м заходнім аддзелам НК замежных спраў тав. **Д. Г. Штэрн** і румынскі пасланік п. **Чыункту** падпісалі ў НКЗС пратакол, зафіксаваўшы акт перадачы.

## Дзенны план за 30 мая выкананы на 114,3 процантаў.

За 30 мая **«Асінторф»** выканаў сутачнае заданне на 84,5 проц., **«Чырвоны сцяг»** — 92,2, завод імя **Гея** — 212,3, імя **Дзімана** — 123, **«Свабода»** — 130,3, **«Лукскае»** — 133,8, **«Дукора»** —106,1, **«Татарка»** — 156 процантаў.

Заводы сістэмы Наркаммясцпрома за 28 мая сутачнае заданне выканалі на 108,3 процантаў.

## ЗНІЖЭ НЕ ЦЭН НА КРУПЫ І МАРГАРЫН

З 1 чэрвеня зніжаюцца розничныя цэны на крупы і маргарын. Цана на кілограм ячневых круп зніжаецца на 60 кап., манных і аўсяных— на 40 кап., пшанно — на 50 кап. і перловых — на 30 кап.

Маргарын замест 17 руб. будзе прадавацца па 14 руб. за кілограм і масла-маргарын па 17 руб. кілограм замест ранейшых 21 руб.

*) Гл. «Звязду» ад 28 і 30 мая.

Спецыяльная тэхнічная камісія Менскага гарадскога совета ўстанавіла, што аварыя адбылася з-за злачынна-нядбайных адносін да сваіх абавязкаў з боку начальніка работ **Гінзбурга** і вытворцы работ **Ксендзова**, з-за дрэннай арганізацыі кантроль і ахову будаўніцтва. Перад пракуратурай рэспублікі ўзбуджана пытанне аб паскарэнні следства і арганізацыі паказальнага працэсу над віноўнікамі аварыі.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.


**СЕННЯ** ў 8 гадзін вечара, у Доме партактыва (вул. К. Маркса) адбудзецца

нарада ўсіх трыкутнікаў прадпрыемстваў і ўстаноў

ПА ПЫТАННЮ

**ПАДРЫХТОЎКІ ДА ПРАВЯДЗЕННЯ СВЯТКАВАННЯ 11 ЛІПЕНЯ—15-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ І СВЯТКАВАННЯ УРУЧЭННЯ БССР ОРДЭНА ЛЕНІНА.**

Бюро гаркома КП(б)Б Прэзідыум горсовета.

Будынак БДТ—1 ГАСТРОЛІ ДРУГОГА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА

Сёння, 1 чэрвеня, **НЕМІНУЧАСЦЬ**

Пачатак роўна ў 8 г. 30 м. веч.

Білеты прадаюцца ў касе тэатра з 12—1 і з 5 г. веч.

**ГОМЕЛЬСКІ ЗООТЭХНІЧНЫ ТЭХНІКУМ**

абвяшчае набор студэнтаў

на першы курс у колькасці 60 чал., на другі курс—20 чал.

У тэхнікум прымаюцца прапоўныя і іх дзеці ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў з падрыхтоўкай: на першы курс у аб'ёме сямігодкі, на другі курс у аб'ёме дзевяцігодкі.

Тэхнікум рыхтуе зоатэхнікаў сярэдняй кваліфікацыі для работы ў соцыялістычнай сельскай гаспадарцы ў якасці памочніка старшага агранома-зоатэхніка. Тэрмін навучання 3 з пал. гады.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй на першым курсе ад 60 да 70 руб. па паспяховасці, і інтэрнатам (койкай, матрацам). Есць сталовая. Да заявы патрэбна прыкласці абавязкова ў арыгінале наступныя дакументы: аб узросце (метрыку), аб сацыяходжанні, асвеце, аб адносінах да вайсковай павіннасці і аб здароўі. Дакументы пасылаць па адрасу: **Гомель, саўгас Брылёў зоатэхнікуму.** Іспыты па грамадазнаўству, матэматыцы, фізіцы і хіміі адбудуцца **з 15 па 20 жніўня г. г.**

Пачатак заняткаў з 1 верасня.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР **„ПРОЛЕТАРЫЙ“**

Сёння і штодзенна гукавая Саюзкінохроніка

**ПРАМОВА тав. СТАЛІНА**

**на ўрачыстым адкрыцці Метрапалітэна 14 мая 1935 г.**

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР **„ПРОЛЕТАРЫЙ“** *Ад 31 мая*

гукавы мастацкі фільм па раману САЛТЫКОВА-ШЧЭДРЫНА

**ІУДУШКА ГАЛАЎЛЁУ**

У гал. ролі нар. арт. **Гардзін.**

КІНО **„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“** *Ад 1 чэрвеня*

новы ўсходні мастацкі фільм вытворчасці ЭРМЕНКІНО

**ГІКОР**

У галоўных ролях заслужн. арт. ГРАЧЫЯ МАХМУРАВА і АВЕТ ТАГАСЯН

У ПРАГРАМЕ кіно-хроніка САЮЗКІНО

**Адзінокаму ПАТРЭБЕН ПАКОЙ**

Пажадана ў цэнтры.

Звяніць па тэлефону 24 471 ад 8 да 10 г. ран. і ад 6 да 7 г. веч.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“

Гукавая Саюзкінохроніка

**Выступленне тав. СТАЛІНА** на урачыстым пасяджэнні, прысвечаным пуску МЕТРАПАЛІТЭНА.

Замежны мастацкі фільм у 2-х серыях

**АДВЕРЖАНЫЯ** 1-я сер.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР ПРОЛЕТАРЫЙ

Дзенныя дзіцячыя сеансы мастацкі фільм з эпохі грамадзянскай вайны

**МЯЦЕЖ**

Пачатак у 1 г. дня

КІНО **„СПАРТАК“**

ад 31 мая—лепшы мастацкі фільм

**„КАЗНЬ“**

драма ў 6 частках

У праграме кіно-хроніка.

Штодзенна 4 сеансы.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР **ДА ВЕДАМА ФАБЗДУМЯСЦКОМУ**

Гастролі **Маскоўскага тэатра ЛЕНСОВЕТА** пачынаюцца **8 чэрвеня г.г.**

**Прыём заявак** на абанементы (пастаянныя месцы) на спектаклі **тэатра Ленсовета** адкрыт **да 5 чэрвеня г.г.**

**Выдача абанементаў** праводзіцца з 29 мая ў рабочай тэатральнай касе пры ЦСПСБ, з 12 г. да 2 г. дня і з 4 да 6 г. веч штодзенна

ДЫРЭКЦЫЯ.

НКА БССР кіраўніцтва цыркавымі, эстраднымі, музычнымі прадпрыемствамі („УЦЭМП“)

**ДЗЯРЖЦЫРК**

(сад „Профінтэрн“)

**3 чэрвеня АДКРЫЦЦЁ ЛЕТНЯГА СЕЗОНА**

**ГРАНДЫЁЗНЫЯ ПРАДСТАЎЛЕННІ** ў 3-х аддз.

з лепшых нумароў і атракцыёнаў

У праграме **ўсе віды цыркавога мастацтва.**

**Канюшні дрэсіраваных коней**

Трупа акрабатаў

Гімнасты

**Музычныя эксцэнтрыкі**

Эквілібрысты

Джыгітоўка

**Клоунада**

Паветраны палёт

Балансёры

**Сатыра і гумар**

Жанглёры на конях і шмат іншых нумароў.

Прымаюцца зняўві на сталыя месца для ўдарнікаў са скідкай 50 проц., а таксама на культпаходы і цалевыя прадстаўленні са скідкай.

За ўсімі даведкамі звяртацца ў кантору дзяржцырка.

Тэлефоны: 21-171 і 22-755.

**2 чэрвеня** г.г., у 7 гадз. вечара, у памяшканні Гарадскога совета, - пакой № 32

адбудзецца

**нарада старшынь ДЭПУТАЦКІХ ГРУП і СТАРШЫНЬ СЕКЦЫЙ**

Яўка абавязкова і без спазнення.

Оргмасавы аддзел горсовета.

**Менскі тэхнікум народнагаспадарчага ўліку**

*абвяшчае*

**АСЕННІ НАБОР СТУДЭНТАЎ**

**на першы курс.**

Прымаюцца асобы, маючыя асвету не ніжэй сямігодкі. Падаваць заяву абавязкова з наступнымі дакументамі: завераная анкета, даведка аб сацыстановішчы, метрыка, арыгінал пасведчання аб асвеце, даведку аб здароўі, 2 фотакарткі і паштовых марак на 40 кап.

Тэхнікум рыхтуе: рабочых інспектараў па ўліку, эканамістаў-уліковікаў для рабпаў, фабрык, заводаў, саўгасаў, калгасаў, эканамістаў-бухгалтараў, інструктараў-статыстыкаў для БССР, Заходняй Калінінскай, Іванаўскай і інш. абласцей СССР.

Тэрмін падачы заяў да 15 жніўня. З 15 па 25 жніўня праводзяцца іспыты па беларускай мове, матэматыцы (пісьмова і вусна, фізіцы і геаграфіі).

Паступаючыя забяспечваюцца інтэрнатам, сталовай і стыпендыяй. Патрэбна мець пры сабе пашпарт.

Заняткі з 1 верасня.

Заявы накіроўваць: Менск, Берасцянская 1, тэхнікум наргасуліку.

Дырэкцыя.

**РАБФАК пры Беларускім дзяржаўным медыцынскім ін-це**

абвяшчае

**АСЕННІ ПРЫЁМ**

на 1, 2, 3 і 4 курс.

Жадаючыя паступіць павінны падаць заяву ў канцылярыю рабфака па адрасу: Менск, універсітэцкі гарадок, медрабфак. Да заявы прыкласці: анкету, даведку аб сацыходжанні, сацстановішчы, асвеце, здароўі, метрыку, аўтабіяграфію і 2 фотакарткі.

На рабфак прымаюцца асобы: на 1 курс з ведамі 5 класаў, на 2 курс з ведамі 6 класаў, на 3 курс—7 класаў, на 4 курс—8 класаў па ўзросце ад 17 да 30 гадоў.

Заявы прымаюцца з 1 мая па 10 жніўня г. г. Студэнты IV курса забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй па ўстаноўленым парадку. Малодшыя курсы інтэрнатам і стыпендыяй не забяспечваюцца.

Іспыты з 10 па 25 жніўня г. г.

Рабфак ня бярэ на сябе выдаткі, звязаныя з прыездам на іспыты.

Дырэкцыя



Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Савецкая, 63, Тэлефоны: прыём тэлефонаграм—21-351, адказны рэдактар—21-352, нам. рэдактара — 25-188, адказны сакратар—21-350; аддзелы: партыйны, культурны——21-353, сельскагаспадарчы — 21-356, прамысловы, савецка-гандлёвы, масавых кампаній і мясцовай інфармацыі—21-354, пісем рабочых і калгаснікаў і работы з рабселькорамі—21-355, замежнай інфармацыі — 25-189, мастацкі—23-955, выпускаючы—21-357;357; заг. выдавецтва — 21-359, прыём аб'яў — 21-360, бухгалтэрыя—21-885.

Ун. Галоўлітбела № Л—641.

Тыраж 90.615 экз.

Менск, друкарня «Звязды».